

ЯРКА, МАЛЯЎНІЧА І НЕЗАБЫЎНА 5

ГІСТОРЫЯ І ДАСЯГНЕННІ 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ВЕРАСНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 181 (30315)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі:**

*«Работа са зваротамі грамадзян — тэма не новая. Яна застаецца для нас актуальнай, на гэта ўказвае нам Прэзідэнт нашай краіны. Сёння, у такім зменлівым свеце, калі ідзе непрыкрытая інфармацыйная атака на нашу краіну, мы павінны размаўляць з людзьмі. Гэтаму садзейнічаюць нашы сустрэчы, якія мы праводзім, прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях. З улікам існуючай дынамікі па рабоце са зваротамі грамадзян мы для сябе зрабілі выснову: кожны месяц будзем выязджаць у асобна ўзятую вобласць і праводзіць прыёмы па асабістых пытаннях, а затым — пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі, каб паглядзець, якія найбольш актуальныя пытанні хвалююць жыхароў той ці іншай вобласці нашай краіны. Прэзідэнт гаварыў нам шмат разоў аб тым, што мы павінны чуць і слухаць людзей. І ўсе пытанні, якія знаходзяцца ў нашай плоскасці, мы павінны вырашаць».*

# На сваёй зямлі ў міры і згодзе

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас з Днём народнага адзінства.*

*Гэта свята гістарычнай справядлівасці, якое сімвалізуе нацыянальнае адраджэнне Беларусі.*

*17 верасня 1939 года здзейснілася адвечнае імкненне беларусаў жыць на сваёй тэрыторыі адзінай сям'ёй у міры і згодзе. З таго часу мы засвоілі ісціну: каб заставацца незалежнымі, трэба быць моцнымі эканамічна, палітычна і духоўна.*

*85 гадоў таму нашы продкі ўз'ядналіся дзеля стваральнай працы на карысць агульнай будучыні. Крок за крокам працоўнымі і ратнымі перамогамі, талентам і энергіяй мільёны людзей умацоўвалі дзяржаўнасць, сцвярджаючыся сярод народаў і культур як моцная духам і прагрэсіўная нацыя.*

*Сёння, калі краіна развіваецца і ўпэўнена ідзе наперад, асабліва важна беражліва захоўваць у сэрцах любоў і павагу да роднай зямлі. Толькі так, агульнымі намаганнямі, мы зможам перадаць нашчадкам ганаровае права беларусамі звацца.*

*Шчыра жадаю ўсім здароўя, дабра і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**У Таццяны і Андрэя САРОКІНЫХ з Мінска — пяцёра дзетак. Сямён, Люба і Іван ужо школьнікі, вучацца ў 25-й сталічнай гімназіі, Васілю 4 гады, а малодшай Марыі — толькі годзік. Іх бацькі па прафесіі інжынеры: тата працуе на Мінскім малочным заводзе № 1, а мама, якая цяпер у дэкрэтным, — у Ваеннай акадэміі.**

## КОРАТКА

• **Напярэдадні Дня народнага адзінства Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб памілаванні яшчэ 37 чалавек, асуджаных за злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці. Сярод памілаваных — шэсць жанчын, шэраг памілаваных маюць хранічныя захворванні, з'яўляюцца інвалідамі, пенсіянерамі.**

• Супрацоўнікі Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў I паўгоддзі 2024 года правялі апытанне насельніцтва, вынікі якога дазваляюць казаць аб тым, што абсалютная большасць беларусаў падзяляе закладзеныя ідэйныя сэнсы ў свята Дня народнага адзінства.


ISSN 1990 — 763X


Тэхналогіі

# НА ПАРОЗЕ НОВАЙ ЭРЫ

Дзе ў нашай краіне прымяняецца штучны інтэлект?



**У сярэдзіне і канцы мінулага стагоддзя штучны інтэлект быў «героем» фантастычных раманаў. У наш час ён хутка ўваходзіць у штодзённасць. Разумныя дамы, разумныя гарады (праект, які сёння рэалізоўваецца ў нашай краіне) або тыя ж галасавыя памочнікі — гэта, скажам так, выкарыстанне штучнага інтэлекту на паўсядзённым, абывацельскім узроўні. А калі глядзець больш глабальна, то сучасная дыягностыка, медыцына і фармацэўтыка, машынабудаванне, дакладнае земляробства, вывучэнне космасу — усё гэта немагчыма без інтэлектуальных тэхналогій.**

СТАР. 7

Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# АКТ ГІСТАРЫЧНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Менавіта так мы называем сёння дату 17 верасня 1939 года, калі пачаўся вызваленчы паход Чырвонай Арміі, вынікам якога стала ўз'яднанне разарваных па жывому народа і зямлі. За 85 гадоў, што мінулі з таго часу, стаўленне да гэтай даты было рознае: то яе шырока святкавалі, то пакідалі толькі на шыльдах назваў вуліц. Тры гады таму яна нарэшце займела належны статус — 17 верасня цяпер дзяржаўнае свята. І гэта таксама ўжо само па сабе акт гістарычнай справядлівасці, бо так і павінна быць.

Найлепш пра тое, што значыў гэты дзень для беларусаў 85 гадоў назад, могуць расказаць жывыя сведкі. Людзей у такім сталым веку ўжо амаль не засталося. Але ёсць газетныя старонкі. Мы знайшлі нумар «Звязды» — святочна-ўрачысты, — датаваны 18 верасня 1939 года, і зрабілі яго рэтраспектыву. Там інфармацыі шмат: паказаны і настрой людзей, і прычына гэтага настрою — пачытайце расповеды пра здзекі



Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

215 (6492) | 18 верасня 1939 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

польскіх паноў, не выдуманыя, запісаныя па гарачых слядах ад саміх беларусаў, якія былі «пад Польшчай». Такое не прыдумаеш. І не даруеш, скажа хтосьці.

Мы даравалі. Але не забыліся. Наша памяць — наш абярэг ад паўтарэння. Чытайце сёння публікацыі 85-гадовай даўнасці, чытайце іншыя матэрыялы па тэме — іх сёння ў нумары няма. Усё, здавалася б, проста і справядліва: адзін народ жыве на сваёй спрадвечнай зямлі ў сваёй краіне. Але якая цана за гэта заплачана і чаго варта сёння гэта захаваць, — вось пра што таксама абавязкова трэба помніць.

СТАР. 8-9

З першых вуснаў

# «Мытня іграе найважнейшую ролю ў забеспячэнні бяспекі як дзяржавы, так і нашых грамадзян»

## Прэзідэнт прыняў з дакладам старшыню Дзяржаўнага мытнага камітэта

**Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся сітуацыяй на граніцы з пункту гледжання мытных органаў. Уладзіміру Арлоўскаму былі зададзены канкрэтныя пытанні: як ажыццяўляецца пераарыентацыя гандлёвых патокаў з Захаду на Усход, якім чынам мытня дапамагае айчынным прадпрыемствам з пункту гледжання транзіту грузаў, як ідзе напаўненне бюджэту краіны па лініі мытных органаў. Традыцыйна ў цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы — і пытанне бяспекі на граніцы.**

«Я ўспамінаю сваю службу на граніцы ў савецкія часы і падумаў перад нашай сустрэчай аб тым, што мытныя органы ды і пагранічнікі сёння ўжо нясуць службу ў абсалютна іншых умовах, — адзначыў на пачатку размовы Прэзідэнт. — Асабліва мытнікі».

Раней, па словах кіраўніка дзяржавы, нягледзячы на жорсткую дысцыпліну на граніцы, работы ў мытнікаў было менш. «Цяпер работы дабавілася значна, асабліва пасля таго, як у нас з'явіліся праблемы з Захадам, — звярнуў ён увагу. — Усё-такі мы пераарыентавалі сваю эканоміку на Усход. Якая цяпер сітуацыя ў сувязі з гэтай пераарыентацыяй гандлёвых патокаў?»

Прэзідэнт ведае, што мытныя органы многае робяць для таго, каб дапамагчы айчынным прадпрыемствам, рэзідэнтам у арганізацыі гандлю. У гэтай сувязі кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якая сітуацыя з транзітам нашых грузаў і як увогуле ўцягнута мытня ў дапамогу для нашых прадпрыемстваў?

«Другое пытанне (яно найважнейшае заўсёды) — якая сітуацыя з плацяжамі па вашай сферы? — удакладніў беларускі лідар. — Як ідзе напаўненне бюджэту краіны па лініі мытных органаў, калі параўноўваць з мінулымі гадамі, мінулым годам і гэтак далей?»

Трэцяе пытанне, на якім Аляксандр Лукашэнка засярodзіў увагу старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта, — пытанне бяспекі. «Мытня іграе найважнейшую ролю ў забеспячэнні бяспекі як дзяржавы, так і нашых грамадзян, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Што ў нас з кантрабандыстамі?»

Пацікавіўся кіраўнік дзяржавы і сітуацыяй на ўкраінскай граніцы. А меры, якія прынялі нашы заходнія суседзі, Аляксандр Лукашэнка ўвогуле параўнаў з «шаленствам»: калі з 26 аўтадарожных пунктаў пропуску на цяперашні момант функцыянуюць усяго пяць. Астатнія, як вядома, аднабаковым рашэннем зачынены.

«Натуральна, можна было б адмахнуцца ад гэтага, сказаць, што санкцыі ўвялі, не гандлюем так з Захадам, як раней, але Беларусь — транзітная краіна, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму для нас гэтая ацэнка важная. Як паўднёвыя і заходнія граніцы ў параўнанні? Ваш пункт гледжання, асабліва ў перспектыве?»

Як паведаміў Уладзімір Арлоўскі, сітуацыя, звязаная з закрыццём пунктаў пропуску і наўмысным перашкодай сумежнымі краінамі руху нашых грузаў, вядома, многае памяняла. У сувязі з гэтым Дзяржаўны мытны камітэт мяняе тэхналогіі і падыходы ў рабоце. «Самае галоўнае — максімальная падтрымка нашых прадпрыемстваў, — канкрэтызаваў ён. — Дапамагаем мяняць лагістыку на Усход. Лагістыка стала больш складаная, шматступенная. Перабудоўваем свае тэхналогіі, каб мы маглі афармляць грузы там, дзе яны знаходзяцца: з любога мытнага пункту, там, дзе ёсць свабодны мытнік. Гэтыя тэхналогіі мы прымяняем пастаянна. Прычым, калі ёсць неабходнасць афармлення ў начны час, у нас ёсць кругласутачныя пункты, якія афармляюць любы груз. Мытня стала больш мабільная і больш даступная для нашага бізнесу».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

У размове з журналістамі **старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ** адзначыў, што цяперашняя сітуацыя на граніцы даволі складаная. Асноўныя пункты пропуску зачынены сумежным бокам, а ў тых пунктах пропуску, якія працуюць, наўмысна стрымліваюць грузапаток. «Таму асноўная тэндэнцыя — гэта пераарыентацыя грузапатокаў на Усход, — падкрэсліў ён. — Сёлета грузапаток праз усходні напрамак павялічыўся ў чатыры разы. Зыходзячы з гэтай тэндэнцыі, мы перабудоўваем сваю работу: максімальна дапамагаем нашым суб'ектам гаспадарання ў выбудоўванні лагістыкі на новым напрамку, забяспечваем апаратыўнае афармленне грузаў з любога пункта мытнага афармлення, дзе б тавар ні знаходзіўся ў краіне, забяспечваем пры неабходнасці кругласутачную работу. Вядома, такая работа дапамагае напаўняць бюджэт у поўным аб'ёме, як дае даручэнне кіраўнік дзяржавы».

Як расказаў Уладзімір Арлоўскі, нягледзячы на закрыццё пунктаў пропуску на ўкраінскім напрамку, беларускія мытнікі засталіся на працоўных месцах. Ажыццяўляецца аддаленае мытнае афармленне грузаў, якія знаходзяцца ўнутры краіны. «Такім чынам мы падтрымліваем кваліфікацыю нашых супрацоўнікаў, нашы абсталяванне і тэхніка знаходзяцца ў працоўным стане, і, калі трэба будзе, мы гатовы ўзнавіць у поўным аб'ёме мытнае афармленне ўжо на граніцы, — падкрэсліў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта. — Інспектар, які свабодны ад работы ў любым пункце краіны, бярэ на сябе афармленне грузу, які патрабуе гэтага ў дадзены момант. Тэхналогія працуе і дазваляе комплексна ва ўсёй краіне, нягледзячы на пераарыентацыю грузапатокаў, закрыццё пунктаў пропуску на заходняй, паўднёвай граніцы, падтрымліваць у цэлым на высокім узроўні знешнеэканамічную дзейнасць нашых суб'ектаў, своечасова афармляць экспартныя, імпартныя патокі».

Уладзімір Арлоўскі звярнуў увагу на тое, што ў сувязі з санкцыямі бізнес перастроіўся на ўсходні напрамак. «Таму адбылося замяшчэнне рынкаў збыту для экспарту, замяшчэнне непасрэдна вытворцаў тых абсталявання, сыравіны, камплектуючых, якія патрэбны нашым прадпрыемствам, — патлумачыў ён. — Яны імпартуюцца з сяброўскіх краін».

Кажучы аб бяспецы на граніцы, кіраўнік ведамства адзначыў, што асноўная задача мытных органаў на заходняй граніцы — не дапусціць у краіну ўвоз небяспечных рэчываў і тавараў. «Мы выяўляем даволі сур'ёзныя аб'ёмы ўвозу ў нашу краіну як зброі, так і боепрыпасаў, патронаў, наркотыкаў, валюты, якая можа быць выкарыстана ў тэрарыстычнай дзейнасці, — канстатаваў Уладзімір Арлоўскі. — Так, за восем месяцаў бягучага года мытнымі органамі выяўлена каля 50 штук агнястрэльнай зброі і частак да яе, каля трох тысяч патронаў, куль, складнікаў боепрыпасаў, каля 2,5 тысячы адзінак халоднай зброі. Наркотыкі — таксама сур'ёзная пагроза нашай краіне. Толькі сёлета выяўлена мытнымі органамі 1300 кілаграмаў наркотыкаў на заходняй граніцы краіны». У ліпені мытнымі органамі быў спынены найбуйнейшы ў гісторыі Беларусі канал наркотыкаў, якія экспартаваліся з Еўрасаюза ў Расійскую Федэрацыю транзітам праз нашу краіну.

Адказваючы на пытанне журналіста, ці ёсць дыялог паміж мытнымі органамі Беларусі і калегамі з сумежных краін на заходнім напрамку, Уладзімір Арлоўскі акцэнтаваў увагу на тым, што яго няма. «Толькі таму, што на гэта ёсць палітычны заказ кіраўніцтва краін Еўрасаюза, — патлумачыў ён. — Ніякіх іншых прычын — ні эканамічных, ні чалавечых — няма. Заўсёды на граніцы быў кантакт і ў пагранічнікаў, і ў мытнікаў з калегамі з сумежных краін. Цяпер, на жаль, такога кантакту практычна няма».

Чаго не скажаш аб узаемадзеянні з іншымі краінамі, з якімі складваюцца выдатныя кантакты. І сведчанне таму — вынікі апошняй сесіі Сусветнай мытнай арганізацыі, калі паміж Дзяржаўным мытным камітэтам Беларусі і мытнымі органамі многіх дзяржаў былі падпісаны дакументы аб супрацоўніцтве, якія прадугледжваюць вялікія планы на будучыню.

Падарунак з нагоды

# У МАГІЛЁВЕ З'ЯВІЎСЯ ПРАСПЕКТ 17 ВЕРАСНЯ

## Такую назву атрымала новая транспартная развязка, трэцяя чарга якой была адкрыта напярэдадні свята

У абласным цэнтры завяршылася будаўніцтва трасы-дублёра вуліц Якубоўскага — Загарадная шаша, якое працягвалася чатыры гады і восем месяцаў. Сімвалічна, што апошняя, трэцяя, чарга аб'екта была ўведзена напярэдадні важнага для беларусаў свята — Дня народнага адзінства. Новая траса, працягласць якой склала болей чым 7 кіламетраў, дазволіць зняць нагрузку з гарадскіх дарог, скарацiць час перамяшчэння па Магілёве і павысіць дарожную бяспеку. Для магіляўчан яна стала сапраўдным падарункам. **Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** назваў падзею знакавай.

— Адкрыццё трасы-дублёра ў поўным аб'ёме зробіць больш камфортным наша жыццё, — паведаміў ён пры адкрыцці аб'екта. — Хачу падзякаваць будаўнікам ДБТ-3 — асноўнаму падрадчыку, і Банку развіцця Беларусі за рытмічнае фінансаванне. Гэты аб'ект не аднаразовая акцыя. Гэта сацыяльна-арыентаваная палітыка нашай дзяржавы, якая выбудавана і дзейнічае на працягу многіх гадоў. Сёння адначасова з адкрыццём гэтай трасы ў абласным цэнтры распачата будаўніцтва яшчэ больш маштабнага праекта — унутрыквальной дарогі коштам арыенціровачна 300—350 мільёнаў рублёў. Спадзяюся, што Банк развіцця Беларусі і будаўнікі спрацуюць таксама зладжана.

Па словах будаўнікоў, у аб'ект укладзена 240 мільёнаў рублёў, а тое, што ён здадзены з апераджэннем тэрмінаў, дапамагло сэканоміць фінансы. У рабоце па максімуме выкарыстоўваліся айчынныя матэрыялы, дарога зроблена цалкам з бетону — гэтага матэрыялу пакладзена болей чым 90 тысяч метраў кубічных. Спецыялісты кажуць, што ён больш даўгавечны і здольны падоўжыць тэрмін карыстання дарожным палатном.

Як адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КРУТОЙ,** які прыняў удзелва ўрачыстым мерапрыемстве, такія цудоўныя аб'екты не толькі робяць камфортным жыццё, але і ўпрыгожваюць горад.

— Вельмі прыемна, што Магілёў паступова перамяшчаецца на верхнія пазіцыі з пункту гледжання добраўпарадкавання, — рэзюмаваў ён. — Гэта высокая адзнака для ўлад горада. У горада добры генплан і планы развіцця, жадаю, каб усё атрымалася выканаць.

Дзмітрый Мікалаевіч ацаніў высокі прафесіяналізм і сумленнасць дарожных будаўнікоў, адзначыўшы, што, калі пачыналася будаўніцтва дарогі, не было ні ковіду, ні санкцый, ні неабходнасці пераразмяркоўваць бюджэтныя грошы і шукаць дадатковыя рэсурсы. Але дарожнікі, нягледзячы на ўсе цяжкасці, змаглі з гонарам выканаць сваю справу і ўклаліся ў нарматыўныя тэрміны.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў таксама, што адкрыццё аб'екта напярэдадні Дня народнага адзінства — вельмі сімвалічная з'ява.

У размове з журналістамі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка нагадаў, што ў рэгіёне развіваецца дынамічна не толькі Магілёў, але і Бабруйск, і райцэнтры.

— Укладваюцца вялікія рэсурсы ў дарожную і вулічная сеткі, дзіцячыя садкі, школы, — аргументаваў ён. — За год мы практычна ва ўсіх школах памянялі вокны. Сёння вядзём будаўніцтва васьмі бальніц-паліклінік, адкрываем новыя дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі. Усё гэта робіцца ў рамках той сацыяльна-арыентаванай дзяржпраграмы, якая існуе. Фінансавыя рэсурсы накіроўваюцца на стварэнне камфортных умоў для жыцця людзей. І невыпадкова сёлета Магілёў заняў 1-е прызавое месца. У адзіночку нічога нельга было б зрабіць. Толькі разам усё атрымліваецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША тэрмінова перакінулі войскі да Аляскі з-за расійска-кітайскіх вучэнняў «Акіян»

Армія ЗША тэрмінова перакінула войскі і ўзбраенні на Алеуцкія астравы (штат Аляска) на фоне расійска-кітайскіх стратэгічных камандна-штабных вучэнняў «Акіян-2024» у Ціхаакіянскім рэгіёне. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на выданне Business Insider. Сярод перакінутага ўзбраення, як адзначае выданне, — сістэмы залпавага агню HIMARS. Галоўнакамандуючы Ваенна-марскім флотам Расіі Аляксандр Маісееў раней паведамляў, што ў вучэннях удзельнічаюць больш за 90 тысяч вайскоўцаў, звыш 400 караблёў і суднаў, уключаючы тры караблі і 15 самалётаў Народна-вызваленчай арміі Кітая. Мінабароны КНР паведаміла, што ў верасні ў водах Ахоцкага і Японскага мораў ВМФ Расіі і ВМС Кітая таксама правядуць планавыя вучэнні «Поўнач. Узаемадзеянне-2024», мэта якіх — паглыбленне міжармейскага стратэгічнага супрацоўніцтва, узмацненне патэнцыялу для рэагавання на пагрозы ў сферы бяспекі.

### Наймацнейшы за 75 гадоў тайфун абрынуўся на Шанхай

Тайфун «Бебінка» абрынуўся на ўзбярэжжа Усходняга Кітая ў раёне Шанхая і суседняй правінцыі Чжэцзян, паведаміла ТАСС. Адзначаецца, што гэта наймацнейшы трапічны цыклон, які даходзіў да мегаполіса з моманту ўтварэння КНР у 1949 годзе. Першы ўдар стыхіі прыняла на сябе прыбярэжная зона новага раёна Пудун. Напярэдадні абодва аэрапорты Шанхая — Пудун і Хунцяа — адмянілі ўсе рэйсы. У горадзе таксама быў спынены рух па ўсіх хуткасных аўтамагістралях, а паромныя зносіны з суседнімі астравамі абмежаваны. Сотням суднаў дадзена ўказанне схавацца ў партах ад непагадзі. Цэнтральнае метэаралагічнае ўпраўленне аб'явіла найвышэйшы ўзровень небяспекі. Улады Шанхая эвакуіравалі з патэнцыяльна небяспечных раёнаў каля 400 тысяч чалавек.



Парламенцкі дзённік

# ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

## Дыялогавая пляцоўка па змяненнях у заканадаўства аб крымінальнай адказнасці прайшла ў Брэсце

**Нараду правяла Пастаянная камісія па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў. Абмеркавалі праект закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці». У памяшканні абласнога суда сабраліся прадстаўнікі пракуратуры, Следчага камітэта, суда, органаў унутраных спраў, грамадскіх арганізацый Брэсцкай вобласці.**



Фота тэлеграм-канала Палаты прадстаўнікоў.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ** заявіла, што дэпутаты гатовы абмяркоўваць прапановы грамадзян па законапраекце аб крымінальнай адказнасці. «Законапраект накіраваны на індывідуалізацыю пакарання, на магчымасць даць судам дыферэнцыравана падыходзіць да прызначэння пакаранняў у залежнасці ад абставін здзейсненага і асобы таго, каго абвінавачваюць, — заўважыла парламентарый. — Напрыклад, рэзананс у грамадстве выклікае пэўная карэкціроўка артыкула 328 (незаконны абарот наркотыкаў) Крымінальнага кодэкса. Гэта найбольш дыскусійнае пытанне на сёння. Прапануецца санкцыі гэтага артыкула лібералізаваць. У частцы 1 названага артыкула з'яўляецца арышт за ўжыванне наркатычных сродкаў. За збыт наркотыкаў першы раз магчыма пакаранне ў выглядзе абмежавання волі. Зніжаецца ніжняя мяжа санкцый часткі 4 артыкула 328 — гэта здзяйсненне злачынства ў арганізаванай групе. Калі раней пакаранне было ад 10 да 20 гадоў пазбаўлення волі, то цяпер гаворка ідзе пра пакаранне ад 8 да 20 гадоў пазбаўлення волі. Пры гэтым ступень грамадскай небяспекі нарказлачынстваў не зніжаецца. Таму гаворка не вядзецца аб тым, што можна менш увагі ўдзяляць барацьбе з незаконным абаротам наркотыкаў».

Яшчэ падчас дыялогавай пляцоўкі гаварылі аб тым, што апошнім часам прапануецца прымяняць больш гуманны падыход да прызначэння пакарання найбольш уразлівым катэгорыям грамадзян, у тым ліку непаўналетнім, інвалідам I і II груп, а таксама адзінокім жанчынам і мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей да 14 гадоў. Адзначалася таксама, што ў ходзе работы міжведамаснай рабочай групы асаблівая ўвага ўдзялялася ўзмацненню прафілактычнага складніка.

Марына Лянчэўская паведаміла, што законапраект плануецца разгледзець у першым чытанні ўжо 17 верасня: «Толькі гэта не азначае, што дыскусія па дадзеным законапраекце спыніцца. Канцэптуальна ён мяняцца не будзе, але мы гатовы абмяркоўваць на пляцоўцы парламента прапановы і меркаванні».

Дарэчы, дыялогавая пляцоўка па абазначанай тэме стала першым такім форумам у рэгіёне. Паводле слоў Марыны Лянчэўскай, у хуткім часе абмеркаванні ў падобным фармаце адбудуцца ў іншых абласцях Беларусі.

У гэты ж дзень Пастаянная камісія па заканадаўстве правяла круглы стол, прысвечаны прававому рэгуляванню натарыята і натарыяльнай дзейнасці. Вывучалі шляхі ўдасканалення заканадаўства з улікам актыўнай лічбавізацыі і іншых павеваў часу.

Парламентарыі таксама пабывалі на ўрачыстым адкрыцці будынка Брэсцкай абласной натарыяльнай палаты.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

З нагоды

# ГОРАД, АДКРЫТЫ ДЛЯ НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

## Чым уразіў міжнародны форум эканамічнага супрацоўніцтва ў Мінску

**Напярэдадні Дня горада ў сталіцы праходзіў міжнародны форум эканамічнага супрацоўніцтва. Панэльныя дыскусіі, выезды на прадпрыемствы і перагаворы ў рэжыме нон-стоп — партфель сумесных заказаў па выніках сустрэчы павялічыўся. Пляцоўка ўжо трэці раз аб'яднала тых, хто гатовы не толькі прадаваць і купляць. Цяперашні форум самы прадстаўнічы. Сёлета ён аб'яднаў гасцей з 29 краін і 22 рэгіёнаў Расіі.**

### «Працуючы разам, можам дасягнуць цудоўных вынікаў»

Перад пачаткам пленарнага пасяджэння і работы тэматычных секцый госці і ўдзельнікі форуму азнаёміліся з выставай прадукцыі 22 сталічных прадпрыемстваў. Экспанатамі сталі халадзільнікі, тэлевізары, тавары лёгкай прамысловасці і гігіенічнага прызначэння, а таксама лекі і гадзіннікі. «Штогадовае правядзенне гэтага эканамічнага форуму дае свае плённыя вынікі, — адзначыў **старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**. — Мы бачым па аналізе інфармацыі, якая паступае ад прадпрыемстваў і арганізацый, што форум дае эфект, бо на гэтай пляцоўцы прадстаўнікі бізнесу могуць знаёміцца, мець зносіны, абменьвацца кантактамі. Гэта прыводзіць у далейшым да заключэння ўзаемавыгадных пагадненняў. Сама ж пляцоўка форуму становіцца цікавай для самых розных напрамкаў».

Мэр горада адзначыў, што штогод з'яўляюцца новыя галіновыя прапановы. У аснове эканомікі ляжыць бізнес, які ўмее дамаўляцца і шукаць кампрамісы. Часта патрабуецца кансалідацыя намаганняў для дасягнення вынікаў. «Такім чынам, магчыма вырашаць многія праблемы. Задача такіх мерапрыемстваў — знайсці агульныя падыходы, даць магчымасць для зносін і абмеркавання. Галоўнае ў сучасным свеце — развіццё камунікацыі, і наш форум з'яўляецца менавіта той камунікатыўнай пляцоўкай, якая дазваляе вырашаць вельмі многія праблемы. Прыемна, што гэтае свята аб'ядноўвае не толькі мінчан, але і нашых шматлікіх сяброў. Сёння тут людзі, якія разумеюць, што міжнародныя адносіны — гэта залог будучыні. Толькі так, мірна вырашаючы любыя пытанні, працуючы разам, мы можам дасягнуць цудоўных вынікаў», — звярнуў увагу Уладзімір Кухараў.

З кожным годам колькасць удзельнікаў форуму павялічваецца. «Гэта сведчыць аб тым, што пляцоўка становіцца цікавай для самых розных напрамкаў. Штогод з'яўляюцца новыя галіновыя прапановы, якія, думаю, будуць становіцца больш аб'ёмнымі і ахопліваць усё больш сфер. Няма ніякіх межаў, магчыма вырашаць любыя праблемы», — дадаў кіраўнік Мінска.

### «Вопыт Мінска стаў асновай»

**Старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл МЯТЛІКАЎ** адзначыў, што Мінск — гэта горад, адкрыты для новых ідэй і праектаў: «Міжнародны форум эканамічнага супрацоўніцтва стаў сталай падзеяй, якая паказвае высокую цікавасць да ўзаемадзеяння. Яшчэ летась удзельнікамі форуму былі прадстаўнікі 21 краіны і 18 рэгіёнаў Расіі. Сёння ж іх колькасць прыкметна павялічылася — 29 краін і 22 рэгіёны Расіі. Мы адкрытыя для абмеркавання ўстанаўлення дзелавых кантактаў і пошуку новых напрамкаў узаемадзеяння, шчыра зацікаўлены ў развіцці гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, умацаванні бізнес-сувязяў, прасоўванні тавараў і паслуг на новыя рынкі».

Даўнія цёплыя адносіны звязваюць Мінск і Бішкек. Сталіцы Беларусі і Кыргызстана заключылі двухбаковае пагадненне па эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве яшчэ ў 1997 годзе. Пра гэта нагадаў **мэр Бішкека Айбек ДЖУНУШАЛІЕЎ**: «Наша супрацоўніцтва ахоплівае многае ў эканоміцы: ад прамысловасці да абмену вопытам у кіраванні гарадскімі працэсамі. Бішкек забяспечвае каля 40 працэнтаў ВУП Кыргызстана. Гэта дало магчымасць інвеставаць сродкі ў мадэрнізацыю інфраструктуры. Мы рэалізоўваем маштабны праект па будаўніцтве сацыяльных аб'ектаў. Гэта важны элемент устойлівага развіцця горада і інвестыцыя ў будучыя пакаленні, іх здароўе, адукацыю, што з'яўляецца ключавым фактарам для развіцця горада і краіны ў цэлым».



Фота БелТА.

Паводле слоў госця, сёння ў Бішкеку ўкараняецца праграма па мадэрнізацыі грамадскага транспарту: «Гэта важны крок па барацьбе з выкідамі вуглякіслага газу ў атмасферу. Таксама пачата будаўніцтва новага смеццеперапрацоўчага завода. Бішкек імкнецца стаць больш экалагічным горадам, і вопыт Мінска стаў асновай. У нас шырока прадстаўлены беларускія тавары, якія карыстаюцца попытам. Гэта прадукты харчавання, тавары народнага спажывання. Нашы камунальныя службы выкарыстоўваюць тэхніку, выпушчаную ў Беларусі. Усё гэта стала магчымым дзякуючы ўдзелу ў эканамічных форумах. А ўзаемадзеянне паміж гарадамі дапаможа хутчэй і больш эфектыўна дасягаць пастаўленых мэт».

На форуме была арганізавана работа некалькіх секцый. На іх прадстаўнікі бізнесу абмяркоўвалі стратэгічныя прыярытэты развіцця эканомікі, інвестыцыйныя і інавацыйныя магчымасці, а таксама перспектывы развіцця індустрыяльных паркаў, тэхнапаркаў і свабодных эканамічных зон Беларусі і Расіі, іх ролю ў выбудоўванні эканамічнай і тэхналагічнай незалежнасці.

### Умацаванне тэхналагічнай незалежнасці

«У Беларусі аказваецца падтрымка малому і сярэдняму інавацыйнаму і вытворчаму прадпрымальніцтву. Гэта дазваляе хутка ўкараніць навукова-тэхнічныя распрацоўкі ў рэальны сектар эканомікі для ўмацавання тэхналагічнай незалежнасці нашай краіны, — распавёў **дырэктар Мінскага гарадскога тэхнапарка Уладзімір ДАВІДОВІЧ**. — Гэта работа заснавана на развіцці суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры, у першую чаргу тэхнапаркаў. Усяго ў Беларусі цяпер налічваецца шаснаццаць тэхнапаркаў, пяць з іх — у Мінску».

Самым буйным у краіне з'яўляецца Мінскі гарадскі тэхнапарк. Ён размяшчаецца на некалькіх пляцоўках: на вуліцы Солтыса і Партызанскім праспекце. У найбліжэйшых планах — пачатак будаўніцтва чарговай пляцоўкі на вуліцы Цэнтральнай. «Тэрыторыю на вуліцы Солтыса ўдалося ператварыць у месца, дзе канцэнтруюцца малыя інавацыйныя прадпрыемствы, розныя навукаёмістыя вытворчасці і лабараторыі, — адзначыў Уладзімір Давідовіч. — Нашы рэзідэнты працуюць у самых розных галінах, у іх ліку — мікраэлектроніка, біятэхналогіі, лазерная тэхніка, оптыка, дакладнае прыборабудаванне і машынабудаванне. Усё гэта стала магчымым дзякуючы шчыльнаму ўзаемадзеянню са сферай навукі».

У міжнародным форуме эканамічнага супрацоўніцтва ўзялі ўдзел кіраўнікі адміністрацый, бізнес-асацыяцый, уласнікі і топ-менеджары буйных кампаній, зацікаўленых у наладжванні і пашырэнні гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, прадстаўнікі арганізацый розных формаў уласнасці Беларусі, Расіі, далёкага і блізкага замежжа.

### Вынік — у лічбах

Па словах старшыні Мінскага гарвыканкама, сталіца бачыць шмат прарыўных кірункаў супрацоўніцтва з краінамі і гарадамі-партнёрамі. Падпісаныя пагадненні — аснова для далейшага развіцця адносін. Ён адзначыў, што былі дасягнуты дамоўленасці аб узаемадзеянні ў розных сферах, якія ў найбліжэйшы час будуць рэалізаваны. «Сёння таксама падпісалі некалькі вельмі важных пагадненняў з гарадамі-пабрацімамі. Гэта дае пэўны штуршок у развіцці розных кірункаў: гандлёва-эканамічных, сацыяльных, культурных і іншых. Такія пагадненні з'яўляюцца базавымі, каб далей па кожным пункце былі зроблены канкрэтныя справы. Бачым, што такія форумы, сустрэчы паказваюць эфектыўнасць — вынік не толькі на словах, але і ў лічбах, — падкрэсліў Уладзімір Кухараў. — Пачынаем развіваць тыя галіны, якія раней не лічылі прыярытэтнымі ці не звярталі на іх увагі».

Затым у гарадской ратушы прайшла ўрачыстая сустрэча з замежнымі дэлегацыямі, якія прыбылі на святкаванне 957-годдзя Мінска. Па яе выніках былі падпісаны двухбаковыя дакументы аб супрацоўніцтве Мінска з Перм'ю, Пензенскай вобласцю Расіі і Бішкекам. «Сёння ў горадзе свята. А якое свята без сяброў і гасцей? — спытаў Уладзімір Кухараў, звяртаючыся да ўдзельнікаў сустрэчы. — У нас шмат агульнага. Нас звязвае жаданне рабіць жыццё нашых жыхароў лепшым».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# «ЛЮДЗІ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО, УСВЕДАМЛЯЛІ СЯБЕ БЕЛАРУСАМІ І ВЫХОЎВАЛІ ТАК СВАІХ ДЗЯЦЕЙ»

## Пра што варта ведаць і памятаць, адзначаючы Дзень народнага адзінства

**На мінулым тыдні падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка падарыў кіраўніку дзяржавы першы экземпляр новай кнігі «Беларусь адзіная», аўтарамі якой сталі Уладзімір Ліхадзедаў і Святлана Харужык. Афіцыйная прэзентацыя кнігі праходзіць сёння, у Дзень народнага адзінства, а мы тым часам пагутарылі з навуковым кансультантам гэтага выдання, намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў, доктарам гістарычных навук Вячаславам ДАНІЛОВІЧАМ. Гаварылі больш не пра саму кнігу, а пра тэму, якая сёння (прычым не ў сэнсе аднаго дня) асабліва актуальная. Пра ўз'яднанне народа, пра яго цану і асэнсаванне, пра адзінства як умову захавання і існавання. Атрымалася гутарка нібыта і з нагоды дзяржаўнага свята, але актуальная не толькі 17 верасня...**

***— Вячаслаў Віктаравіч, у выданні «Беларусь адзіная» вы выступілі ў якасці навуковага кансультанта. Менавіта з пункту гледжання гістарычнай навукі раскажыце, чым унікальнае гэта выданне, што новага з яго мы даведаемся, чаго не ведалі раней.***

— У нашай гістарычнай навуцы даследаванне гісторыі Заходняй Беларусі і працэсу ўз'яднання мае даволі глыбокія карані. Выдадзена шмат навуковых матэрыялаў, ёсць вялікі пласт навуковага асэнсавання гэтых падзей. Але нам на сёння не хапала папулярнага выдання, якое тэзісы, абгрунтаваныя ў навуковых працах, магло б наглядным чынам данесці да вялікай колькасці людзей. І якраз выданне «Беларусь адзіная» зроблена менавіта папулярным. Там няма нейкіх новых навуковых тэзісаў, але абсалютна новая форма падачы ў выглядзе нагляднага дакументальнага і фотаілюстрацыйнага матэрыялу па тым, што адбывалася ў Заходняй Беларусі, і тым, што адбывалася ў БССР, — такі параўнаўчы аспект. Праз фотаздымкі, праз дакументы паказана, як падзялілі беларускага народа, — імгненні польска-савецкай вайны, што адбывалася на акупаваных тэрыторыях, Рыжскі мірны дагавор. Таксама паказана, што адбывалася пасля падзелу, — грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча ў Заходняй Беларусі і адначасова — як гэта было ў Савецкай Беларусі. Паказваецца, як «пад Польшчай» беларусы змагаліся за свае правы, за сваю ідэнтычнасць, — усё гэта з дапамогай ілюстрацый, фотаздымкаў, фрагментаў друкаваных выданняў — фактычна ўпершыню такая падача ў навукова-папулярным выданні. У чалавека, які азнаёміцца з кнігай, складзецца поўнае — нагляднае — уяўленне аб тым, што адбывалася ў той час у Заходняй Беларусі і паралельна ў БССР, як адбывалася ўз'яднанне і чаму менавіта 17 верасня вызначана датай дзяржаўнага свята.

***— Для вас асабіста ў гэтым выданні было штосьці новае?***

— Калі казаць пра фактуру — напэўна, не, я сам займаўся вывучэннем гісторыі Заходняй Беларусі. Уразіла найперш ідэя гэтай падачы — паказаць жыццё абедзвюх частак Беларусі менавіта на супрацьпастаўленні ў адным выданні. Калі да мяне з гэтай ідэяй звярнуўся Уладзімір Ліхадзедаў, адзін з аўтараў кнігі, я быў прыемна ўражаны і падумаў, што павінна атрымацца штосьці цікавае, чаго дагэтуль не было...

***— Увогуле, здаецца, што ў падачы і асэнсаванні тых падзей мы толькі на пачатку шляху: мы ведаем шмат, але не ўсё. Паралель, магчыма, недарэчная па маштабе трагедыі, але гэта, на мой погляд, падобна на справу аб генацыдзе беларускага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Здаецца, вядома было за восемдзесят гадоў усё. Але калі заняліся ўсур'ёз мэтанакіравана — колькі дагэтуль невядомых фактаў раскрылася... Атрымліваецца, усяму свой час, і да дэталёвага***



***вывучэння трагедыі часткі беларускага народа на працягу 18 гадоў польскай акупацыі справа яшчэ дойдзе, магчыма, і на заканадаўчым узроўні. Можа, і праўда, вылучыць такую ініцыятыву, улічваючы цяперашнія адносіны польскага кіраўніцтва да Беларусі?***

— Трэба сказаць, што згаданы вамі Закон «Аб генацыдзе беларускага народа» якраз і прадугледжвае злачынствы супраць беларускага насельніцтва ў гады вайны і ў пасляваенны час. А пасляваенны час — гэта злачынствы найперш польскіх фарміраванняў — так званых «праклятых жаўнераў», Бурага і астатніх, якія чынілі на тэрыторыі Заходняй Беларусі сапраўдны генацыд...

***— Але ж і да 1939 года беларусаў на тэрыторыі, якая была «пад Польшчай», хацелі знішчыць як народ, няхай сабе і не фізічна...***

— Тут варта казаць пра этнацыд, калі беларусаў хацелі асіміляваць, каб яны перасталі лічыць сябе беларусамі... Можна, канешне, і на заканадаўчым узроўні весці размову аб прызнанні і фіксацыі фактаў этнацыду. Інфармацыі, дарэчы, тут немала, пытанне вывучалася дэталёва. Польшча ў той час была шматнацыянальнай дзяржавай, уласна палякі там складалі толькі 65 працэнтаў ад усяго насельніцтва. А які тады лозунг быў у польскіх улад? «Польшча для палякаў». Міністр юстыцыі Аляксандр Мейштовіч у сярэдзіне 1920-х гадоў прамым тэкстам заявіў, што беларусы павінны быць асіміляваныя, ператвораны ў палякаў. І гэта была заява чалавека, які адказваў за выкананне заканадаўства. А паводле Рыжскага мірнага дагавора, Польшча абавязвалася забяспечыць захаванне нацыянальных правоў беларусаў, як і ў Канстытуцыі тагачаснай Польшчы дэклараваліся правы нацыянальных меншасцяў на нацыянальнае і культурнае развіццё... А ў 1934 годзе міністр замежных спраў Польшчы Юзаф Бек ужо ў Лізе нацый адкрыта заявіў, што Польшча адмаўляецца ад усіх гарантый на сваіх тэрыторыях для нацыянальных меншасцяў...

***— А як з пункту гледжання гісторыі можна патлумачыць такі парадокс. Беларусы, якіх 18 гадоў прыгняталі і спрабавалі пазбавіць нацыянальнасці, веры, мовы, вельмі хутка ўсё забылі і даравалі. І пра дату 17 верасня, калі б у тым ліку не падзеі 20-га года, многія хутка нават і не ўспаміналі б. Палякі ж, якім тут асабліва ганарыцца няма чым, найперш калі кіравацца еўрапейскімі каштоўнасцямі, што дэкларуюцца, не забываліся пра гэту дату ніколі і, нават знаходзячыся ў сацыялістычным лагеры, марылі вярнуць «свае» тэрыторыі. Што ўжо казаць пра сёння — некаторыя польскія палітыкі нават не ўтойваюць жаданне ўзяць рэванш. Адкуль такое рознае ўспрыняцце ў суседніх народаў? Асаблівасці нацыянальнага характару?***

— У першую чаргу гэта асаблівасць характару дзятычыцца польскіх эліт. Яны, на жаль, урокі з гісторыі выносіць не хочуць і паранейшаму пакутуюць фантомнымі болямі з нагоды нашых заходніх зямель. І робяць многае, каб падтрымаць гэты рэваншысцкі дух у грамадстве... Мы вельмі правільна зрабілі тры гады назад, калі вярнулі ў наш святочны пералік дат менавіта 17 верасня — дату, калі пачаўся вызваленчы паход Чырвонай арміі. Дарэчы, гэта дата ўжо ў кастрычніку 1939-га года на Народным сходзе Заходняй Беларусі ў Беластоку была прапанавана як святочная, як дата вызвалення беларускіх працоўных ад прыгнёту польскіх паноў. І яе ў 1940-м ужо шырока адзначалі. А потым здарылася вайна. Пасля вайны было не да свят, але 10-годдзе вызвалення ў 1949 годзе адзначылі вельмі маштабна. Пасля гэтага пайшоў спад, гэту дату вырашалі асабліва не педаліраваць... Чаму? Ну, вось такі ў нас усходнеславянскі менталітэт. Польшча ж ужо ў адным з намі сацыялістычным лагеры, у суседзяў у жыцці рознае бывае, што ўжо тое ўспамінаць... А ў Польшчы было наадварот. Яны заўсёды, пры любой уладзе, гэту дату негатыўна афарбоўвалі для сябе. Дарэчы, у савецкі час беларусы, якія ўдзельнічалі ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе, той жа самы Максім Танк, увесь час стараліся давесці кіраўніцтву рэспублікі, што павінна быць дата, якая адзначае ўз'яднанне і тэрыторыі, і народа. І ўрэшце гэтага ўдалося дабіцца — у студзені 1990 года Вярхоўны Савет БССР устанавіў як святочную дату ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР 14 лістапада — дзень прыняцця ў 1939 годзе закона, які завяршыў працэс аб'яднання. Але і гэта свята мы не паспелі адзначыць: праз год не стала ні Савецкага Саюза, ні БССР.

***— Але ж з'явілася Рэспубліка Беларусь. Чаму ж тыя эліты, якія дэкларавалі нацыянальнае адраджэнне, не паклапаціліся, каб уз'яднанне народа было адзначана?***

— Сярод тых прадстаўнікоў эліты, якія, як вы сказалі, дэкларавалі нацыянальнае адраджэнне, большасць арыентавалася на Захад. А заходняя прапаганда даводзіла, што Савецкі Саюз вінаваты ў развязванні Другой сусветнай вайны, што гэта ён падзяліў Польшчу з нацысцкай Германіяй. А Польшча ж ужо нібыта і там, на Захадзе. Будзем расказваць пра 1939 год — а раптам нас туды не возьмуць? Вось чым кіравалася тагачасная эліта. А грамадства — яно ў любым выпадку інерцыйнае, асабліва ў цяжкія часы, якія былі ў нас у 1990-х. І тут яшчэ варта зноў згадаць наш менталітэт: мы для ўсіх, нават для нядаўніх ворагаў, адкрытыя, мы гатовыя да супрацоўніцтва, да ўзаемадзеяння. Мы не згадваем старыя крыўды для таго, каб сапсаваць адносіны сёння. Наша адзіная ўмова: паважайце нас. А цяпер мы дайшлі яшчэ да адной важнай ісціны: на сваю гісторыю трэба глядзець менавіта сваімі вачыма, а не вачыма суседзяў. Падзеі 2020 года паказалі, што польскія эліты ўспрымаюць наша спакойнае разважлівае стаўленне да гэтай даты як праяву нашай слабасці.

***— Так. І жыхары Гродна расказвалі, што падчас пратэстаў 20-га года аднекуль узяліся людзі, якія хадзілі па горадзе з польскімі сцягамі і выкрыквалі: «То ест нашэ място!»...***

— Ну, гэта актывізаваліся так званыя некамерцыйныя недзяржаўныя арганізацыі, якія сядзелі на пайку ў заходніх фондаў і якіх задзейнічалі для пэўных мэт, калі прыйшоў час. А ўручэнне гэтай мяккай сілы была добра адпрацаваная — адна «карта паляка» чаго вартая. Яны свае рэваншысцкія планы ніколі не забываліся і мэтанакіравана працавалі на іх увасабленне. А людзі нашы, на жаль, купіліся на гэтыя «плюшкі». І тут справа ў выхаванні. На жаль, у Савецкім Саюзе на яго змярканні не маглі выхаваць сапраўдных патрыётаў. Тых, хто за нейкія матэрыяльныя выгоды не пагодзіцца адмовіцца ад сваёй нацыянальнасці. А маладое пакаленне яшчэ і бачыла фармалізм сістэмы, якая дэкларавала высокія ідэалы, а насамрэч людзі думалі пра матэрыяльнае. І повязь пакаленняў у пэўны момант перарвалася. А гэта ў любым грамадстве страшна.

***— Ваша доктарская дысертацыя, ведаю, прысвечана беларускай моладзі міжваеннага часу. Што датычыцца моладзі Заходняй Беларусі — як, на ваш погляд, гэтыя хлопцы і дзяўчаты змаглі застацца беларусамі, атаясамліваць сябе менавіта з беларускім народам, змагацца за яго вызваленне, калі ў іх не было магчымасці вучыцца на роднай мове, калі іх прымушалі паўтараць: «Хто ты естэм? Поляк малы...» Можа, менавіта там, у тым часе трэба шукаць падказку, як выхоўваць сённяшніх маладых людзей, каб яны не адракліся ад народа і ад Радзімы?***

— Тут справа менавіта ў сіле духу. Які быў найперш у сям'і. Пры тым, што праводзілася бескампрамісная палітыка паланізацыі: у 1938 годзе не было ўжо ніводнай беларускамоўнай школы — самі польскія чыноўнікі прызнавалі, што ўсё ідзе не так, як хацелася б. У адным з навуковых зборнікаў мы апублікавалі пратакол сакрэтнай нарады кіраўнікоў чатырох ваяводстваў, якія ахаплівалі якраз тэрыторыю Заходняй Беларусі, — Віленскага, Беластоцкага, Навагрудскага і Палескага. Абмяркоўваючы праблемы паланізацыі насельніцтва гэтых зямель, яны адзначалі, што на дзяржаўным узроўні дзеля дасягнення мэты робіцца ўсё, але большасць людзей ну ніяк не хочуць адчуваць сябе палякамі. Нават у Віленскім ваяводстве, дзе найбольш каталікоў, — і там не хочуць быць палякамі! Гэта сведчыць, як ні патэтычна гучыць, аб сіле духу нашага народа. Людзі, нягледзячы ні на што, усведамлялі сябе беларусамі і выхоўвалі так сваіх дзяцей. Сям'я — першаасноwа. Працяг — сістэма адукацыі. Як сказаў Уінстан Чэрчыль пасля вайны, фашызм перамог савецкі настаўнік. Які выхаваў маладых патрыётаў, хто дзеля Радзімы не шкадаваў жыцця.

***— А вось польскі настаўнік зрабіць з беларускіх дзяцей палякаў не змог...***

— Таму што ён быў несправядлівы, таму што ён навязваў паланізацыю штучна. А справядлівасць — гэта спрадвеку адзін з ключавых прынцыпаў нашага народа. А польская ўлада ў Заходняй Беларусі была да беларусаў несправядлівая. Яна не давала магчымасці развівацца ў сваім культурным асяроддзі, цярпела і вера: колькі праваслаўных цэркваў зрабілі касцёламі...

***— Пра трагедыю Вялікай Айчыннай мы гаворым: калі забудземся — паўторыцца. Думаю, тое самае дарэчы сказаць і пра трагедыю раздзеленага народа ў 1921—1939. Навуковых даследаванняў па тэме ў нас ужо даволі шмат, але яны не для «масавага карыстання». Магчыма, каб людзі не забыліся, тут не хапае матэрыяльнага ўвасаблення? Адметнага мемарыяла, сучаснай «белетрыстыкі»? Бо мемарыяльнай экспазіцыі ў Бярозе, адной навукова-папулярнай кнігі, аднаго фільма «На другім беразе», напэўна, мала...***

— Згодзен. Сёння варта гаварыць пра годны помнік тым беларусам, якія ахвяравалі сваё жыццё, каб народ аб'яднаўся. Дарэчы, яшчэ ў кастрычніку 1939 года Уладзімір Царук, дэлегат Народнага сходу Заходняй Беларусі, прапанаваў на сходзе ўстанавіць помнік усім загінулым за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне ад польскага прыгнёту. Прапанова была падтрымана аднагалосна, помнік вырашылі паставіць у Беластоку. На жаль, да сёння такога помніка няма. А памяць павінна мемарыялізавацца належным чынам. Але самае галоўнае — каб мы бачылі гэты перыяд свайго жыцця менавіта з пазіцыі свайго народа і сваёй дзяржаўнасці, каб не саромеліся адзначаць гэты дзень, як і іншыя даты, якія для нашага народа адназначна станоўчыя, няважна, што пра гэта думаюць суседзі ці не суседзі. У нас свой погляд на наша гістарычнае мінулае. Тут, канешне, важная пазіцыя кіраўніцтва краіны. Менавіта з падачы Прэзідэнта ў нас галоўным святам стала дата вызвалення Мінска ад фашыстаў, менавіта ён паўтарае нам, што захаваць галоўную каштоўнасць — суверэнітэт — мы можам толькі тады, калі захаваем адзінства. Вось яны, вельмі важныя пасылы, якія дазваляюць нам ужо восемдзесят год жыць пад мірным небам...

***— ...І восемдзесят пяць гадоў як адзін народ. Варта і гэта праз коску дадаваць.***

— Абсалютна правільна! Добры пачатак пакладзены — дзяржаўнае свята 17 верасня ў нас ужо ёсць.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ЯРКА, МАЛЯЎНІЧА І НЕЗАБЫЎНА

## Мінск адсвяткаваў свой дзень нараджэння

**Штогод у другую суботу верасня Мінск адзначае Дзень горада. Сёлета нашай любімай сталіцы споўнілася 957 гадоў. У гэты дзень кіраўніцтва горада арганізавала насычаную праграму. Свята адчувалася ва ўсіх кутках Мінска. Гараджане і госці змаглі ўзяць удзел у спартыўных спаборніцтвах і інтэлектуальных квэстах, убачыць гістарычную рэканструкцыю, пачуць музыку з савецкіх фільмаў і многае іншае. Карэспандэнт «Звязды» далучыўся да народных гулянняў.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мінск — горад, ахутаны легендамі, горад-герой, горад магчымасцяў. Тут гарманічна пераплятаюцца гісторыя і сучаснасць, выразна праглядаюцца новыя гарызонты ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Гэта сапраўды горад для жыцця, дзе мары і надзеі становяцца рэальнасцю.

Святочная праграма пачалася з урачыстай цырымоніі ўскладання кветак каля стэлы «Мінск — горад-герой». Жыхары і госці сталіцы з самай раніцы прыйшлі сюды, каб ушанаваць памяць удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія загінулі пры абароне нашай Радзімы. **Памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Юрый ФРАЛОЎ** пасля цырымоніі ўскладання кветак адзначыў: «Сёння мы аддаём даніну памяці нашым папярэднім пакаленням, продкам, якія сваёй працай, доблесцю і мужнасцю дамагліся для нас таго, што маем. І мы павінны захаваць гэта і прымножыць. Памятаем іх дасягненні, ганарымся імі. Мы ганарымся нашай сталіцай, якая з кожным днём становіцца толькі прыгажэйшай».

Затым народнае свята перайшло ў цэнтр горада. Жыхары і госці сталіцы змаглі наведаць Міжнародны фестываль гісторыі і культуры «Мінск старажытны — 2024» і ўбачыць рэканструкцыю Польскага паходу Чырвонай Арміі, прымеркаваную да Дня народнага адзінства. Зялёную зону каля скрыжавання праспектаў Машэрава і Пераможцаў запоўнілі рыцарскія баі, турніры лучнікаў і арбалетчыкаў, кірмаш рамеснікаў, сярэднявечная музыка і больш за 20 гістарычных клубаў з Беларусі і замежжа.

Розныя пляцоўкі працавалі каля Палаца спорту. Там госці свята змаглі стаць удзельнікамі алімпійскага дня. На пляцоўцы было прадстаўлена некалькі дзясяткаў лакацый, дзе кожнае дзіця да 14 гадоў магло праверыць свае магчымасці ў розных відах спорту. Усяго алімпійскі квэст прапанаваў 32 дысцыпліны, сярод якіх футбол, баскетбол, тэніс, стральба з лука, дзюдо, бокс, веславанне і многія іншыя. За праходжанне заданняў юныя ўдзельнікі атрымлівалі пячаткі, якія адпавядаюць паказанаму выніку: залатую, сярэбраную або бронзавую. Па заканчэнні квэсту пераможцы атрымалі прызы. Для гасцей свята, старэйшых за 14 гадоў, быў арганізаваны інтэлектуальны камандны турнір на адпаведную тэматыку.

Тут жа госці свята змаглі стаць гледачамі і балельшчыкамі спаборніцтва «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік». У ім удзельнічалі ратавальнікі нашай краіны, а таксама В'етнама, Санкт-Пецярбурга і Цюменскай вобласці Расіі. Пераважна ў гэтым відзе спорту спаборнічаюць мужчыны, але складаныя практыкаванні выконваюць і дзяўчаты. Паказвалі сябе ў катэгорыях «Індывідуальныя забегі», а таксама «Тандэм», «Тандэм-мікс» і «Камандная эстафета».

«Праводзіць такія мерапрыемствы ў Дзень горада стала ўжо добрай традыцыяй, — распавёў **старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**. — З кожным годам колькасць дэлегацый павялічваецца. Вы моцныя, смелыя, мужныя людзі, якія штодня сутыкаюцца з вялікай небяспекай. І на гэтых спаборніцтвах, вядома ж, адбываецца папулярызацыя службы ў падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях. Многія маладыя людзі, бываючы на гэтай пляцоўцы, затым уступаюць у шэрагі падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях».

На плошчы Свабоды канцэрт «Хіты Прэзідэнцкага аркестра» завяршыў летні музычна-турыстычны сезон. Прагучалі вядомыя песні, у тым ліку музыка да савецких кінафільмаў, створаная кампазітарам Аляксандрам Зацэпіным і паэтам-песеннікам Леанідам Дзербянёвым.

Упершыню ў Траецкім прадмесці на тэрыторыі Верхняга горада быў рэалізаваны праект «Мінск губернскі», дзе жыхары і госці сталіцы змаглі акунуцца ў атмасферу XIX—XX стагоддзяў. Там былі і прадстаўнікі прафесій, што знікаюць: чысцільшчык абутку, газетчык, кветачніца, а таксама жывыя скульптуры і жывая карціна. Уздоўж Свіслачы расцягнуліся шэрагі з вырабамі рамеснікаў: з дрэва, бісеру, саломкі...

Акрамя таго, на пляцоўцы Верхняга горада адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод «Мінчанін года» і святочны канцэрт. «Сёння адзначаем 957-ы дзень нараджэння любімага Мінска — горада, які нас аб'ядноўвае. Горада, які практычна на працягу тысячагоддзя даказваў сваё права на існаванне», — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў.

Мэр Мінска дадаў, што сталіцу адбудоўвалі многія пакаленні мінчан, у тым ліку аднаўлялі з руін пасля апошняй разбуральнай вайны: «На працягу 80 гадоў жыхары ўсё зрабілі, каб Мінск быў такім прыгожым, квітнеючым, камфортным для пражывання. Гэта дарагога варта. І сёння мы ўшаноўваем людзей, якія сваёй працай, высокім прафесіяналізмам, адказным стаўленнем да справы, імкненнем да дасканаласці, укараняючы новыя тэхналогіі, даказалі, што вартыя высокага звання «Мінчанін года».

Уладзімір Кухараў падзякаваў усім, хто прыйшоў на свята, хто робіць свой унёсак у развіццё сталіцы або добраўпарадкоўвае двары, дамы. «Новых здзяйсненняў на карысць нашага горада і нашай Радзімы!» — пажадаў ён.

У парку Горкага адбылося сямейнае свята. Працавалі дзіцячыя зоны, зоны для дарослых, танцпляцоўка, выстава работ прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, разгарнуўся фестываль прафесій. Тэматычныя зоны, гульнявыя пляцоўкі і прэзентацыі ўстаноў адукацыі запрашалі людзей усіх узростаў пазнаёміцца з найбольш запатрабаванымі эканомікай спецыяльнасцямі. Уздоўж набярэжнай і алеі разгарнулася 12 пляцовак з прадстаўленнем паўсотні прафесій. Галоўныя лакацыі — «Служба ратавання», «Медыцынскі пункт», «Арт-тэрыторыя», «Салон прыгажосці», «Транспарт і сувязь», «Прамысловасць», «Будаўнічы трэст», «Швейная атэлье» і «Разумны дом».

Завяршальным момантам Дня горада стала феерверк-шоу, якое жыхары і госці сталіцы маглі назіраць у скверы «Старосцінская слабада».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**


Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.

# ГОРАДУ НАД СОЖАМ — 882

## Дываны кветак, святочныя лакацыі і шэсце прадстаўнікоў розных прафесій...

**Святочная праграма распачалася мітынгам каля манумента «Вечны агонь». Традыцыйна да знакавага месца памяці прыйшлі прадстаўнікі ўлады, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты, а таксама прадстаўнікі дэлегацый Расійскай Федэрацыі, Сербіі, Азербайджана, Кітая, Казахстана і гарадоў-пабрацімаў Гомеля. Гамяльчане і госці горада ўшанавалі памяць герояў-пераможцаў, якія падарылі магчымасць жыць у міры і згодзе на сваёй зямлі.**



Каб далучыцца да святочных мерапрыемстваў і павіншаваць жыхароў горада над Сожам, у абласны цэнтр прыехалі 15 афіцыйных дэлегацый. Іх святочны прыём прайшоў у палацы Румянцавых-Паскевічаў.

Гамяльчане і госці горада акунуліся ў атмасферу маштабнага шэсця, якое прайшло на цэнтральнай плошчы імя Леніна. У святочным парадзе, прысвечаным Дню нараджэння Гомеля, калектывы прамысловых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый прадставілі эканамічны патэнцыял горада. У маштабным шэсці па цэнтральнай плошчы прайшлі тысячы гамяльчан розных прафесій.

Цэнтр Гомеля ператвараўся ў казачную кветкавую краіну. Жыхары раёнаў горада, навучэнцы і педагогі ўстаноў адукацыі прапанавалі ацаніць фотазоны і кампазіцыі, якія яны сваімі рукамі вырабілі з жывых кветак.

Уздоўж адной з цэнтральных вуліц Гомеля — у скверы імя Грамыкі — разгарнуўся традыцыйны фестываль «Вінаград Гомельшчыны», удзел у якім прымалі мясцовыя вінаградары і прадстаўнікі гэтай галіны з розных рэгіёнаў. У скверы імя Грамыкі, дарэчы, на асаблівую радасць усіх сем'яў з дзецьмі, можна было трапіць у горад дзяцінства з дзясяткамі інтэрактыўных гульнявых зон.

Адчуць радасць ад добрай традыцыі дарыць падарункі ў дзень нараджэння гараджане і госці горада змаглі ў скверы Дружбы. Тут прайшла ўрачыстая перадача 23 аўтамабіляў хуткай дапамогі для медустаноў горада.

Цэнтрам прыцягнення жыхароў і гасцей абласнога цэнтра стала гомельская набярэжная ракі Сож. Тут размясціліся экспазіцыі працоўных дасягненняў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый горада, а таксама выставачныя праекты, якія знаёмілі са старонкамі гісторыі Гомеля і яго сучаснага развіцця. На адной з лакацый студэнты з Кітая, якія навучаюцца ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны, прапанавалі далучыцца да кітайскай культуры, музычнага і выяўленчага мастацтва. Выставачныя лакацыі брэндаў Гомеля — прадпрыемстваў «Камінтэрн» і «8 Сакавіка» — прапанавалі акунуцца ў свет мадэлінгу, пазнаёміцца з навінкамі дзелавых і паўсядзённых гарнітураў адзення, выраблены у горадзе над Сожам.

Акрамя таго, падарункам для гамяльчан на цэнтральнай набярэжнай стаў фестываль вулічнай ежы. Частаваліся прыгатаваным 20-метровым дранікам. На ручным млыне на імправізаваным падворку Гомельскага камбіната хлебапрадуктаў з дапамогай сапраўднага млынара ахвотныя змаглі выпрабаваць свае сілы і змалоць зерне.

Здзіўляла гараджан і гасцей абласнога цэнтра і святочная лакацыя на пляцоўцы каля Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Тут прайшоў фестываль «Гігантаманія». Так, прадпрыемствы горада над Сожам прэзентавалі сваю прадукцыю ў вялікіх фарматах. Можна было не толькі ацаніць незвычайныя падыход вытворцаў, але і пакаштаваць любімыя прысмакі гіганцкіх памераў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# НА ПАРОЗЕ НОВАЙ ЭРЫ

## Інтэлектуальныя сістэмы

Сёння паняцце «штучны інтэлект» ва ўсіх на слыху. І хоць не ўсе могуць адразу сказаць, што ж гэта такое, так ці інакш меў зносіны з ім практычна кожны. Напрыклад, сутыкаліся ў сеціве, дзе нейрасетка «ажыўляе» карціны вялікіх мастакоў ці партрэты класікаў літаратуры або «малюе» абстрактныя паняцці. Хоць сферы ўжывання штучнага інтэлекту значна шырэйшыя і больш сур'ёзныя, чым забаўляльная сфера. Штучны інтэлект — гэта праграмны комплекс, які мае некаторыя ўласцівасці чалавека: можа рабіць высновы і генерыраваць рашэнні, складаць планы і навучацца. Інтэлектам ён завецца, таму што яго работа засноўваецца на нейронавых сетках, гэтак жа, як разумовыя працэсы чалавека — на нейронах мозгу. Менавіта таму сістэма можа навучацца і набываць у працэсе дзейнасці новыя навыкі, як гэта адбываецца з чалавекам. Сёння беларускія вытворчасці актыўна прымяняюць тэхналогіі штучнага інтэлекту ў розных сферах эканомікі, падкрэсліў **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей КРУГЛІКАЎ.**

Навуковец расказаў, што інтэлектуальнымі сістэмамі Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі і ў цэлым Акадэмія навук займаюцца ўжо даўно. Так, напрыклад, яшчэ дзесяць гадоў таму абарону нашай краіны ўмацавалі два беспілотныя комплексы блізкага радыуса дзеяння, якія былі распрацаваны і пастаўлены на ўзбраенне яшчэ ў 2014 годзе.

— Комплекс выдатна прайшоў усе стадыі выпрабаванняў і атрымаў серыйную вытворчасць, — распавёў дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі. — Ён быў распрацаваны за ўласныя сродкі Ваеннай акадэміі. Тады ніхто не казаў пра штучны інтэлект, хаця ўсе сістэмы там інтэлектуальныя. І ў цэлым усе аўтапілоты, якія выкарыстоўваюцца на розных паветраных суднах — гэта ўсё высокаінтэлектуальныя складнікі.

У апошнія гады інтэлектуальныя сістэмы прымя-



няюцца для праектавання лекавых прэпаратаў, стварэння інавацыйных малекулярных злучэнняў, угнаенняў і высокатэхналагічных матэрыялаў. Укараняюцца ў самыя розныя вытворчасці. Так, пры вытворчасці аўтатранспарту штучны інтэлект прымяняецца ў электроніцы, аўтамабілі збіраюць рабатызаваныя сістэмы, аснашчаныя інтэлектуальнымі алгарытмамі. Не адстаюць і харчовыя прадпрыемствы.

— Напрыклад, «Савушкін прадукт» укараніў у сябе рабатызаваную платформу і актыўна прымяняе інтэлектуальныя сістэмы для атрымання новых малочных прадуктаў, — паведаміў Сяргей Круглікаў.

Вучоныя актыўна ўзяліся за ўкараненне штучнага інтэлекту ў аграпрамысловы комплекс, адзначыў эксперт.

— Гэта адзін з элементаў інтэлектуальнай сельскай гаспадаркі, якая называецца «дакладнае земляробства», — удакладніў ён.

Як і ўсе найбольш інавацыйныя сферы сучаснасці, штучны інтэлект рухаецца наперад вельмі хутка, і сёння яго развіццю ў нашай краіне ўдзяляецца ўвага на самым высокім дзяржаўным узроўні, расказаў вучоны.

— У інстытуце мы займаемся цэлым шэрагам напрамкаў, дзе выкарыстоўваюцца інтэлектуальныя сістэмы. Выконваюцца цікавыя работы па інтэлектуалізацыі працэсаў, якія былі да гэтага аўтаматызаваны, але патрабуюць пэўных сістэм падтрымкі прыняцця рашэнняў. Вядома, канчатковае рашэнне прымае чалавек, але другое меркаванне таксама вельмі важнае, — падкрэсліў Сяргей Круглікаў.

## Другое меркаванне

«Другое меркаванне» — не метафара, а дакладны тэрмін. Што гэтае паняцце азначае, растлумачыў **загадчык лабараторыі аналізу біямедыцынскіх выяў Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Эдуард СНЯЖКО:**

— Наша лабараторыя працуе з данымі, атрыманымі ад медыцынскіх спецыялістаў, у асноўным з выявамі, але таксама і лабараторнымі, клінічнымі данымі. Лепш за ўсё знаёмыя канчатковым спажыўцам сістэмы, якія падаюць другое меркаванне экспертам. Яны не замяняюць рашэнне чалавека, але дапамагаюць яму звярнуць увагу на тыя ці іншыя асаблівасці даных, каб не прапусціць іх і асацыіраваць з пэўнымі працэсамі ў арганізме чалавека.

Як патлумачыў вучоны, у розных краінах частата тых ці іншых захворванняў розная, і нават эксперт у пэўнай галіне можа быць мала знаёмы з рэдкімі для яго рэгіёна захворваннямі. І тут не памыліцца дапамога штучны інтэлект. Інтэлектуальныя сістэмы, якія прадстаўляюць другое меркаванне, дазваляюць рабіць аналіз больш уніфікаваным, паўтаральным, меней залежным ад стомленасці чалавека або яго кваліфікацыі (мінімізаваць праславуты «чалавечы фактар»), аўтаматызаваць працу спецыяліста.

Але многія пытанні, звязаныя з выкарыстаннем штучнага інтэлекту ў медыцынскай сферы, пакуль патрабуюць дэталёвай прапрацоўкі, расказаў вучоны:

— Гэта, у прыватнасці, бяспека такіх сістэм. Мы ведаем, што сістэму можна прымусіць памыліцца, і павінны вучыцца бараніцца ад магчымых нападаў. Паколькі ў свеце ўсё шырэй выкарыстоўваюць такія сістэмы, мы павінны ўмець з імі працаваць і абараняць іх.

Яшчэ адзін кірунак работы вучоных звязаны з навучаннем штучнага інтэлекту.

— Медыцынскія даныя маюць абмежаванае выкарыстанне: там шмат персанальнай інфармацыі. Клінічныя цэнтры не гараць жаданнем абмяняцца з даследчыкамі данымі, якія неабходны для навучання такіх сістэм. Адпаведна, трэба недзе іх браць. Адным са шляхоў з'яўляецца генерацыя штучных выяў, даных, на якіх навучаюцца сістэмы. І гэта вельмі глыбокая тэма. Вы, напэўна, бачылі, як генерыруюцца выявы і відэа ў забаўляльных мэтах, але ў нашай вельмі спецыялізаванай вобласці таксама ёсць у гэтым неабходнасць. Таму праводзіцца вялікая праца і ў нас, і ва ўсім свеце, па разумнай генерацыі штучных выяў, якія б нам сапраўды дапамагалі, — падкрэсліў Эдуард Сняжко.

Адзін са шляхоў навучання інтэлектуальных сістэм — тэхналогія федэратыўнага навучання, распавёў ён. Яна не прадугадвае абмену данымі паміж медыцынскімі ўстановамі: навучанне нейрасетак ідзе на агульным серверы. Акрамя таго, для навучання нейрасетак ствараюцца абязлічаныя даныя аб пацыентах.

## Правы і абавязкі

Відавочна, што ўжо на сучасным этапе выкарыстанне штучнага інтэлекту патрабуе прававога рэгулявання. І ў наступным годзе ў СНД завершыцца распрацоўка мадэльнага закона аб тэхналогіях штучнага інтэлекту, праінфармаваў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей КАСАНІН.**

— Мы заключылі дагавор у рамках СНД аб распрацоўцы мадэльнага закона аб тэхналогіях штучнага інтэлекту. Трэці этап работы над гэтым законам ужо завершаны. У 2025 годзе мы павінны прадставіць канчатковы варыянт. Мэта — уніфікацыя заканадаўства краін, якія ўваходзяць у СНД, у гэтай сферы, — удакладніў Сяргей Касанін.

У Беларусі пры Савеце па пытаннях прававой і судовай дзейнасці пры Прэзідэнце Беларусі створана рабочая група для падрыхтоўкі аналітычнай запіскі аб прававым рэгуляванні выкарыстання і развіцця тэхналогій штучнага інтэлекту.

— Рабочая група павінна да лістапада падрыхтаваць аналітычную запіску Прэзідэнту, што мы будзем рабіць у краіне ў прававым полі рэгулявання штучнага інтэлекту. На дадзены момант мы прааналізавалі ўсё заканадаўства ў найбуйнейшых сусветных аб'яднаннях і развітых краінах, а таксама беларускае заканадаўства. Пытанні штучнага інтэлекту ў нас фрагментарна адлюстраваны ў парадку 30 нарматыўных актаў. Можа, мы прапануем пайсці па шляху Расіі, выдаць указ ці закон, які вызначыў бы канцэпцыю развіцця штучнага інтэлекту. Можа, прапануем дапоўніць усе нашы нарматыўныя акты, да адзінай думкі прыйсці ў гэтых дакументах у галіне штучнага інтэлекту. На III Форуме IT-Акадэмгарада «Штучны інтэлект у Беларусі» правядзём круглы стол, абмяркуем, як будзем далей рухацца ў галіне заканадаўчага рэгулявання штучнага інтэлекту ў нашай краіне, — канкрэтызаваў ён.

Распрацоўка прававых дакументаў, звязаных са штучным інтэлектам, на парадку дня ва ўсім свеце. Так, у суседняй Расіі ў 2019 годзе зацверджана нацыянальная стратэгія развіцця штучнага інтэлекту на перыяд да 2030 года.

— Работы па развіцці штучнага інтэлекту ў Расіі цяпер ідуць паскоранымі тэмпамі, — падкрэсліў Сяргей Касанін.

А ў 2023 годзе Кансультатыўны орган па штучным інтэлекце пры Генеральным сакратары ААН падрыхтаваў прамежкавую справаздачу аб праблеме ШІ, сказаў ён.

— Акрамя таго, 21 мая 2024 года Савет ЕС адобрыў рэгламент аб штучным інтэлекце, прыняты Еўрапейскім парламентам, — дадаў вучоны.

## Вынікі і перспектывы

Асноўныя кірункі даследаванняў і развіцця інтэлектуальных тэхналогій эксперты абмяркуюць у ходзе дзелавой праграмы III Форуму IT-Акадэмгарада «Штучны інтэлект у Беларусі». Будуць падведзены вынікі дзейнасці ў галіне штучнага інтэлекту за год, намечаны шляхі далейшага прасоўвання гэтых тэхналогій, закладзены, як ужо гаварылася, асновы развіцця заканадаўчай базы ў галіне штучнага інтэлекту ў нашай краіне. Форум адбудзецца з Мінску 10—11 кастрычніка. Дзелавая праграма збярэ вучоных на базе Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Будзе і экспазіцыйная частка, разлічаная ў тым ліку на непрафесіяналаў — тых, хто жадае проста паглядзець і ўразіцца. Яна разгорнецца ў будынку Прэзідыума НАН. Форум, дарэчы, будзе прымеркаваны да святкавання дня нараджэння Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Інбелкульт был рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук 13 кастрычніка 1928 года).

— Форум «Штучны інтэлект у Беларусі» набывае міжнародны ўзровень, — канстатаваў кіраўнік Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі.

— Спецыялісты з Расіі будуць удзельнічаць у дыялогавых пляцоўках, пакажуць свае распрацоўкі. Нашы кітайскія партнёры з Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» таксама хочуць паказаць распрацоўкі ў галіне перспектыўнай робататэхнікі, выкарыстання перадавых тэхналогій КНР, кіравання рознымі наземнымі сродкамі. Сербскія калегі жадаюць да нас прыехаць, — паведаміў Сяргей Круглікаў. — З ліку беларускіх партнёраў чакаем у тым ліку рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій. Дзіцячыя тэхнапаркі, маладзёжныя аб'яднанні разгорнуць свае пляцоўкі, будзе адукацыйны вузел.

Таксама на форуме падвядуць вынікі адкрытага конкурсу «Лідары штучнага інтэлекту ў Беларусі». Пераможцы будуць названы ў трох намінацыях — «Кампанія», «Праект» і «Прадукт». Запланавана таксама правядзенне хакатона ў галіне штучнага інтэлекту (хакатон — форма работы, дзе спецыялісты ў адной камандзе вырашаюць пастаўленыя задачы, спаборнічаючы з іншымі камандамі). Удзельнікамі гэтага спаборніцтва стануць студэнты ВНУ Беларусі.

Пакуль разважанні людзей, далёкіх ад лічбавага свету, аб штучным інтэлекце часцей за ўсё зводзяцца да пытання, ці заменіць ён, напрыклад, журналістаў або дызайнераў, мастакоў і ў цэлым людзей творчых прафесій, адзначылі навукоўцы. Не заменяць, запэўнілі яны. Прынамсі, на дадзеным этапе развіцця інтэлектуальных сістэм. Але пры ўмове, што размова ідзе аб сапраўдных прафесіяналах сваёй справы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Надвор'е

# ТРЭЦІ ТЫДЗЕНЬ «ДАДАТКОВАГА ЛЕТА»

**На гэтым тыдні да нас завітаў у госці сонечны антыцыклон, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Гэта дазволіць шырокай вобласці павышанага атмасфернага ціску блакіраваць доступ у краіну атмасферным франтам і звязаным з імі масівам дажджавой воблачнасці. Таму на гэтым тыдні жыхарам нашай краіны на ападкі разлічваць не варта. У сувязі з чым сухое надвор'е будзе спрыяць захаванню на большай частцы тэрыторыі краіны высокай пажарнай небяспекі. А па ўсходзе Беларусі дзейнічае надзвычайная пажарная небяспека з чырвоным узроўнем. Яшчэ ў бліжэйшыя дні ў краіне захаваецца не па сезоне цёплае надвор'е з тэмпературным фонам у асноўным на 2—6 градусаў вышэй за кліматычную норму.

Сёння ў выніку паступлення цёплай паветранай масы начныя мінімумы складуць ад 9 да 15 градусаў, па поўначы месцамі — 5—8 градусаў, днём паветра прагрэецца да 23—28 цэпла. Аднак з сярэдзіны тыдня паветраныя патокі памяняюць свой напрамак з паўднёва-ўсходняга на паўночны, і ў краіну пачне паступаць паветраная маса ўмераных шырот. Тэмпературны фон паступова стане ніжэйшым, набліжаючы кліматычную восень. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будуць згушчацца непраглядныя туманы.

У сераду — пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 да 14 градусаў, удзень — 21—27 цяпла.

Пасля цяпло пачне адступаць, але толькі на некалькі градусаў. У чацвер таксама будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў, удзень будзе 21—26 цяпла.

Не чакаецца традыцыйных восеньскіх дажджоў і ў пятніцу з суботай. У гэтыя дні ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—10 цяпла, месцамі да 13 градусаў, днём паветра прагрэецца да плюс 19—25 градусаў.

Не прадказваюць сіноптыкі ападкі і ў нядзелю. У гэты дзень ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—10 градусаў, месцамі да 13 цяпла. Днём тэмпература будзе падымацца да 17—24 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Ликвидатор ОАО «Автометрия» Фотя Д.С.**
**организует аукцион по продаже следующего имущества, находящегося в собственности ОАО «Автометрия»:**

| № п/п | Наименование материалов | Ед. изм. | Кол-во | Стоимость бел. руб. (без НДС) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ЛОТ 18 | Линейка монтажника 1 шт., машинка пишущая «Ятрань» 1 шт. охранная сигнализация 1 шт., измеритель Е 78 1 шт., измеритель ФОК 1 шт., измеритель XI-50 1 шт., измеритель XI-50 1 шт., осциллограф 1 шт., осциллограф С 1 шт., осциллограф С 1 шт., осциллограф С 1 шт., осциллограф С 1 шт., осциллограф С 1 шт., пылесос KP 6835 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 18 966,34 рубля. Шаг торгов 48 руб. Задаток 97 руб. | | | |
| ЛОТ 19 | Уст-во для контроля ТВ 1 шт., компьютер «пилот» 1 шт., компьютер «Пилот» 1 шт., компьютер портативный 1 шт., ноутбук ППК 1 шт., принтер Laser 1 шт., принтер OKIPACN 1 шт., принтер HP Lazer Jet P 1102 1 шт., рабочая станция 6085 1 шт., графопостроитель 1 шт., копировальный аппарат Kyocera 1 шт.. ксерокс 1 шт.. к р Clasik 1 шт., компрект ЭВМ 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 19 595,18 рубля. Шаг торгов 30 руб. Задаток 60 руб. | | | |
| ЛОТ 20 | Принтер OKI C3100 1 шт., принтер XEROX Phaser 3116 1 шт., принтер XEROX Phaser 3116 1 шт., перфоратор 1 шт., мебель 1 ко, ролеты защитные 1 ко., кофеварка автоматическая Saeco Odea Giro Plus Cappuccino 1 шт., печь СВЧ 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 20 127,72 рубля. Шаг торгов 6 руб. Задаток 13 руб. | | | |
| ЛОТ 21 | Автоматический выключатель ВА 161С-25А 1 шт., автоматический выключатель ВА 163С-16А 6 шт., автоматический выключатель ВА 47-39 13 шт., автоматический выключатель ВА163С-25А 1 шт., акустическая система Sven 1 шт., амперметр Э 8030 М1 50 А 2 шт., антена телевизионная 1 шт., антенна ANT GSM EG-GSM-04/K SMA-M 2,5M 14 шт., антенна GSM GKA-GSM-003 14 шт., антенны RG174 ROHS 20 шт. Начальная цена торгов по лоту 21 411,66 рубля. Шаг торгов 21 руб. Задаток 41 руб. | | | |
| ЛОТ 22 | Бокорези мини 120 мм (кусачки) 2 шт., бокс навесной VIKO 2 шт., бороздодел 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 22 200,87 рубля. Шаг торгов 10 руб. Задаток 20 руб. | | | |
| ЛОТ 23 | Видеокамера 1 шт. видеорегистратор автомобильный 2 шт. Начальная цена торгов по лоту 23 211,34 рубля. Шаг торгов 11 руб. Задаток 21 руб. | | | |
| ЛОТ 24 | Вилка DT-015 2 шт., вилка РП10-15 с кожухом 10 шт., вилка РП10-30 з 6 шт., винт 4,2*16 100 шт., выключатель авт. ВА 47-100 3Р 100А 1 шт., выключатель авт. ВА 47-29 1Р 1А 1 шт., выключатель авт. ВА 47-29 1Р 20А 2 шт., выключатель авт. ВА 47-29 1Р 2А 1 шт., выключатель авт. ВА 47-29 1Р 4А 2 шт., выключатель авт. ВА 47-29 2Р 4А 6 шт., выключатель авт. ВА 47-39 1Р 16А 3 шт., выключатель автоматический ВА47-29 2Р 10А 2 шт., выключатель автоматический ВА47-29 3Р 3А 2 шт., выключатель нагрузки ВН32 3Р 100А 2 шт., выключатель нагрузки ВН32 3Р 63А 1 шт., выключатель поворотный черный ZB2-EJ2 2 шт., выключатель поворотный черный ZB2-EJ3 2 шт., гидрометр психрометрический ВИТ-1 1 шт., гильза ГЦР 5 шт., гнездо сдвоенное под тюльан 12 шт., дрель-шуруповерт аккум. WORTEX 1 шт., дроссель 12RS104C 18 шт.. дэпо 7035 2 шт., дюбель гвоздь 6х60 7 шт., заглушка UL94V-U 4 шт., звонок ЗД-47 1 шт., извещатель охранный магнитоконтактный 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 24 442,15 рубля. Шаг торгов 22 руб. Задаток 44 руб. | | | |
| ЛОТ 25 | Изолента ПВХ 0,13х19ммх20м красная 6 шт. изолента ПВХ 0,13х19ммх20м синяя 5 шт., индикатор напряжения (пробник) 100-500В 1 шт., источник питания имрульсный 15ВТ 1 шт., кабель АВВГ 2х2,5 20,05 м, кабель и антенный выход 3 шт., кабель телефонный 10 шт., карта электронная топл. 1 шт., каска защитная 5 шт., каска строительная 2 шт., кембрик 3 мм ТВ-40 1 шт., кембрик 5мм 02, шт., кембрик 5мм ТВ-40 4 ,7 шт., клавиатура Gembird клавиатура Gembird 1,0 шт. Начальная цена торгов по лоту 25 185,64 рубля. Шаг торгов 9 руб. Задаток 19 руб. | | | |
| ЛОТ 26 | Клавиатура LOGITECH K120 1 шт., клавиатура Sven STANDARD 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 26 25,85 рубля. Шаг торгов 2 руб. Задаток 3 руб. | | | |
| ЛОТ 27 | Клеммник 2CDGB-5.08-10P-14-OOAH (роз) 46 шт., клеммник 2EDGK 5.08-10P-14 20 шт., клеммный блок DC-330-5.0-02P-12-00-AH 125 шт., клемная колодка CUK2.5 B 100 шт. Начальная цена торгов по лоту 27 321,14 рубля. Шаг торгов 16 руб. Задаток 32 руб. | | | |
| ЛОТ 28 | Клемник 2CDGB 5.08-10P-14-00A(H) 20 шт., клемник 2CDGB 5.08-10P-14-00AH 14 шт., клемник 2CDGB 5.08-10P-14-00AH (розетка) 5 шт., клемник 2CDGB 5.08-5P-14-00AH 30 шт., клемник 2CDGB 5.08-5P-14-00AH (розетка) 5 шт., клемник 2EDGK 5.08-10P-14 115 шт., клемник 2EDGK 5.08-12P-14 30 шт., клемник 2EDGK 5.08-5P-14 34 шт. Начальная цена торгов по лоту 28 782,9 рубля. Шаг торгов 39 руб. Задаток 78 руб. | | | |
| ЛОТ 29 | Кожуж РП10-22 8 шт., кожух разъема DB 25C 19 шт., кожух разъема DP-09C 54 шт., кожух РП10-30 30 шт., колодка PTF 14A 1 шт., комплект наклеек CT-2005 15 шт., комплект наклеек УПД 2015 59 шт. Начальная цена торгов по лоту 29 359,17 рубля. Шаг торгов 18 руб. Задаток 36 руб. | | | |
| ЛОТ 30 | Коплект монт. част Ду32 2 шт., коробка распаячная ОП 1 шт., коробка распр. ОП IP54 42 шт., корпус Z 1 21 шт., корпус Z 17 5 шт., корпус Z108 4 шт., корпус защитный кожух Z17WJ 5 шт. Начальная цена торгов по лоту 30 579,06 рубля. Шаг торгов 29 руб. Задаток 58 руб. | | | |
| ЛОТ 31 | Корпус Рп10-30 ЛП 5 шт., крашка лотка 32 шт., 1 шт., крыша на металический лоток основание 50мм-0,55 9 шт., лампа светодиодная А80 1 шт., Начальная цена торгов по лоту 31 270,56 рубля. Шаг торгов 14 руб. Задаток 27 руб. | | | |
| ЛОТ 32 | Магнитоконтактный датчик 5 шт., магнитоконтактный датчик FBMC002 9 шт., магнитоконтактный датчик FBMC006 8 шт., магнитоконтактный датчик арт. FBMC002 10 шт. Начальная цена торгов по лоту 32 24,36 рубля. Шаг торгов 2 руб. Задаток 3 руб. | | | |
| лот 33 | Метеостанция PTRS8750EZB 1 шт., микросхема FX614P3 8 шт., микросхема SIM800F 11 шт., микросхема ADM232AANZ 30 шт., микросхема AT89C4051 7 шт., микросхема LM2576HVT-5.0 6 шт., микросхема LM2576HVT-ADJ/NOP8 12 шт., микросхема LM2576S-ADJ/NOP8 18 шт., микросхема LM2576S-ADJ/PB 50 шт., микросхема LM2596T-ADJ 7 шт., микросхема TL431CLP 26 шт., микросхема РП10-22 вилка 20 шт., миниизмеритель DS 2002 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 33 1292,37 рубля. Шаг торгов 65 руб. Задаток 130 руб. | | | |
| ЛОТ 34 | Многофункциональное устройство CANON PIXMA 1 шт., модем GSM Citenon 5 шт., мышь CANYON 1 шт., мышь LOGITECH 1 шт., 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 34 848,96 рубля. Шаг торгов 42 руб. Задаток 85 руб. | | | |
| ЛОТ 35 | Огнетушитель ОП-4 5 шт., отвертка 100 мм 1 шт., отвертка 3х75 2 шт., отвертка 80 мм 1 шт., панель PLCC44 61 шт., панель SCS20 18 шт., ПАППИС крбк+кршк 25х34х26 133 шт., переключатель кулачковый LW 5-40 АТРИОН 1 шт., переходник dip8-soic 8 2 шт., перфоратор BOSCH GBH 2400set 1 шт., перфоратор WORTEX 1 шт., перчатки диэлектрич. 1 шт., перчатки х/б 9 шт. Начальная цена торгов по лоту 35 549,42 рубля. Шаг торгов 28 руб. Задаток 55 руб. | | | |
| ЛОТ 36 | Печатная плата BKSA 301411.897.01 11 шт., печатная плата BKSA 301411.897.02 18 шт., печатная плата PS BUG v1.0 9 шт., печатная плата ST2IM 14 шт., печатная плата UPDS 09 4 шт. Начальная цена торгов по лоту 36 1365,6 рубля. Шаг торгов 68,28 руб. Задаток 137 руб. | | | |
| ЛОТ 37 | Пластмассовая крышка клемника, серого цвета, новая EP-RTP4-6-10 90 шт., плата PVST2R 12 шт., плата PVST2R 5 5 шт., площадка самоклеющаяся ТМ-40 40х40 20 шт. Начальная цена торгов по лоту 37 122,87 рубля. Шаг торгов 6 руб. Задаток 13 руб. | | | |
| ЛОТ 38 | Преобразователь Е842/1 0..5/-0..5ма 6 шт., прибор концентрации паров этанола «Алконт-01су» 1 шт., пробник 220в 1 шт., провод МГШВ 0.2 100 шт., провод ПВС 5 х 0,75 129 шт. Начальная цена торгов по лоту 38 754,19 рубля. Шаг торгов 38 руб. Задаток 75 руб. | | | |
| ЛОТ 39 | Провод ШВВП – 2 х 0,5 50 шт. Прокладка паронитовая 10 шт., ПЭВМ HAFF «Optima» 1 шт., ПЭВМ «JET I» 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 39 696,48 рубля. Шаг торгов 35 руб. Задаток 70 руб. | | | |
| ЛОТ 40 | Разъем 91236-0001 10 шт., расходомер РСВУ-1400 ДУ 200 мм 1 шт., расчетная книга по з/плате 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 40 232,72 рубля. Шаг торгов 12 руб. Задаток 24 руб. | | | |
| ЛОТ 41 | Реле тепловое JRS1-09310 4-6A 4 шт. реле тепловое JRS1-25322 18-25A 2 1 шт., реле тепловое JRS1-40353 2 шт., розетка ВА16-214 2 шт., розетка РП10-15 1 шт., розетка РП10-22ЛП-П 5 шт., розетка тлф 16 шт. Начальная цена торгов по лоту 41 101,01 рубля. Шаг торгов 5 руб. Задаток 10 руб. | | | |
| ЛОТ 42 | Сверло HSS DIN 338 3,5х39х70 мм 2 шт., сверло HSS DIN 338 4,0х43х75 мм 3 шт., сверло HSS DIN 338 4,5х47х80 мм 3 шт., сверло ц/х d2,5 5 шт., сверло ц/х D4,2 4шт., светильник 1 шт., сердечник МН 2000 Ш 8х8 14 шт., сканер Canon 1 шт., скобосшиватель 3 шт., скобы 9 мм 120 шт., соединитель RJ45 2 шт., сплитер D-Link ADSL 2 шт. Начальная цена торгов по лоту 42 80,27 рубля. Шаг торгов 4 руб. Задаток 8 руб. | | | |
| лот 43 | Стабилитрон Кр1180ЕН9А 80 шт., таймер электронный ТЭ-02 КС 3 шт., телефон SAMSUNG 1 шт., телефон ЖК SAMSUNG 2 шт., телефонный аппарат AL 140 1 шт., тепловое реле JRS1-25322 2 шт., терм. сопр. ДТС3225 7 шт., терм. сопр. ДТС035М-50М.0,5.400.И [3;0...+150С] 8 шт., термометр 4 шт., термометр техническ. ТТП-2МК 240 103 1 шт., термометр цифровой ТЦ-Б-DS18S20 с гильзой и бобышкой 4 шт. Начальная цена торгов по лоту 43 1829,44 рубля. Шаг торгов 92 руб. Задаток 183 руб. | | | |
| ЛОТ 44 | Термопреобразователь ТСПА -PL Pt100/В 1 шт., трансформатор ТП-5-1-14 6 шт., трансформатор тока ТОП-0.66-1-5-0 1 шт., трещетка (ручка клуппа) 1 шт., трос буксировочный 1 шт., уголок 50х50х4 0,019мп, уголок анкерный 40х320х40 47, уголок крепежный 40х90х90 мм 14 шт., уголок УКП-006 10 шт., уголок УКП-008 9 шт., флэш Mirex 8gb 1 шт., хомут-стяжка 3,6х250 мм 150 шт., хомут-стяжка 4,0х250 мм 100 шт., хомуты 100х2,5мм, пластиковые 100 шт. хомуты 300х3,6 мм 200 шт. Начальная цена торгов по лоту 44 274,07 рубля. Шаг торгов 14 руб. Задаток 27 руб. | | | |
| ЛОТ 45 | Чайник электрический Tefal 1 шт., чайник электрический ЕК-12 белый 1 шт., шайба М 5 0,670 кг, шпилька м16х1000 Ц6 16 шт., шпилька резьбовая М5х1000 мм 6 шт. Начальная цена торгов по лоту 45 182,78 рубля. Шаг торгов 9 руб. Задаток 18 руб. | | | |
| ЛОТ 46 | Щит распределительный с монтажной панелью ЩРНМ-2 IP31 1 шт., щит с монтажной панелью ЩРНМ-4 Mecas 1 шт., щит ЩМП-1000х650х300 IP 54 2 шт., щит ЩМП-1200х750х300 IP54 1 шт., щиток защитный 1 шт., щиток сварщика с самозатемняющимся светофильтром 1 шт. Начальная цена торгов по лоту 46 943,44 рубля. Шаг торгов 47 руб. Задаток 94 руб. | | | |

**Торги состоятся 18.10.2024 в 16.00 по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13**. Размер задатка должен быть внесен на следующий расчетный счет продавца: № BY35 PJCB 3012 5039 4910 0000 0933 в ОАО «Приорбанк», г. Брест, BIC: PJCBBY2X не позднее 17.10.2024.

Заявление на участие в торгах и прилагаемые к нему документы принимаются до 17.00 17.10.2024 по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13, предварительно согласовав время подачи по телефону +375 29 7287201. Выигравшим торги признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Победитель аукциона в день его проведения подписывает протокол о результатах аукциона. Договор купли-продажи предметов торгов (лотов) должен быть заключен не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Деревное»** (продавец)
проводит открытый аукцион

## по продаже клуба бригадного

*(составные части и принадлежности – кирпичная пристройка)*
**с инвентарным номером № 622/С-46004**
**общей площадью 89,2 кв. м,**
**расположенного на земельном участке**
**с кадастровым номером 625485804601000101**
**(право аренды по 16.06.2115) площадью 0,1111 га**
**по адресу: Минская область, Столбцовский район,**
**д. Лубень, ул. Новая, 17А.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона ЛЭП напряжением до 1000В, пл. 0,0025 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 4 255,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 425,00** бел. руб.

Стоимость снижена на 50 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.2024.

Аукцион состоится **01.10.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.09.2024** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 175-82-98, (8017) 175-82-17.**

УНН 600014473

ЗАО «Центр промышленной оценки» (УНП 191021390) –
проводит первые повторные торги
в форме открытого аукциона по продаже:

**лоты №№ 1 – 15 – здания и сооружения,**
**лот № 16 – здание насосной БОВ-2**
**и узел № 2 сооружений оборотной системы**
**водоснабжения с краном 10л-16,5-12,**

расположенные по адресу:
**Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15,**
принадлежащие ОАО «Мозырский спиртоводочный завод»
(Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) –
производство по делу об экономической несостоятельности
(банкротстве) № 118-10Б/2016).

С порядком оформления участия в аукционе,
с общими правилами проведения можно ознакомиться
на **www.bankrot.gov.by** либо на сайте организатора аукциона
**www.cpo.by** и по тел: +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна);
+375 29 8717025 (Валерий Петрович)» на сайте www.cpo.by

**Аукцион состоятся 02.10.2024 в 13.00**
по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512.
Заявки принимаются с 9.00 17.09.2024
по 01.10.2024 до 17.00 по указанному адресу.

УНП 400084274

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 9 октября 2024 года открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадь 56,6 (2,8; 34,0; 19,8) кв. м** в изолированном помещении с инвентарным номером № 340/С–213112. – Помещение связи. Помещение на 6-м этаже. **Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Советская, 66-2. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0 | **251,30** | **251,30** |
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76 | | |
| **Срок подачи заявления** | **С 17.09.2024 г. по 07.10.2024 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот №_ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса» | | |
| **Условия пользования** | **Условия:** Срок договора аренды – 5 лет. Цель использования – для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) | | |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 3 (три) базовые величины, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) | | |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %.**

**К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.**

**Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы:** юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 16 мая 2023 г. № 138 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а так же в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

# «ВЕЦЕР НА ДАРОГАХ ЗВЁЎ НАС. ШАЛЁНЫ ВЕЦЕР...»

## Творы пра вызваленчы рух Заходняй Беларусі 1920—1930-х

**Калі ў 1921-м, паводле Рыжскага дагавора, адбылося падзел Беларусі, напэўна, не было ў нас такога літаратара, які б не адгукнуўся на гэта. Хто абураным вершам, як Алесь Дудар, хто нават прыгодніцка-фантастычным раманам, як Янка Маўр... Пісалі і па гарачых слядах падзей, у тыя ж 1920—1930-я, і пазней, асэнсоўваючы перажытае з адлегласці гадоў. Давайце ўспомнім самыя адметныя творы пра тагачаснае жыццё Заходняй Беларусі, пра тое, як чакалі беларусы таго дня, у які сёння мы адзначаем Дзень народнага адзінства.**

### ЯНКА БРЫЛЬ «СІРОЧЫ ХЛЕБ»



Самы вядомы, напэўна, твор — пранізлівая аповесць Янкі Брыля «Сірочы хлеб», у якой шмат аўтабіяграфічнага. Твор вядомы нам яшчэ са школьнай праграмы, але варта перачытаць яго і тым, хто даўно скончыў школу.

*«Данік быў сірата. Бацьку яго забілі на вайне з польскімі панамі, у дваццатым годзе. Хлопчык яшчэ зусім няшмат разумеў у тым, хто такія паны і чаму яго тата не хацеў іх пусціць сюды, у Заходнюю Беларусь. Данік ведаў адно — тата быў вельмі вясёлы і добры. Нібы праз сон успамінаецца,— у шэрым шынялі, з чырвонай зоркай на шапцы, тата казытаўся вусамі і рагатаў, падкідаючы Даніка на руках... Мама кажа, што бацька, калі наша армія гнала паноў на захад, толькі «вады напіцца» забег. Пайшоў, а назад не вярнуўся...»*

Хлопчыку Даніку па мянушцы Сівы даводзіцца ісці ў школу, дзе ўсё выкладаюць па-польску. Ну і напакутаваўся:

*«Пачаў чытаць вершык, які трэба было вывучыць на памяць. У вершыку польскі хлопец Янэк хваліўся сваёй маме, што ён наловіць многа рыбы. А потым:*

*Ловіл Янэк до полудня,*
*Маёнц пружнон храпкэн...*

*На гэтай «храпкэн» Сівы і засеў. Што гэта за «храпка»? Думаў, думаў — дарэмна. Успамінаў, успамінаў... Не, настаўнік не гаварыў ім нічога пра гэтае слова. У мамы не спытаешся: яна пайшла з кудзеляй. Ды, зрэшты, колькі ў яе ні пытайся, толькі і будзе адказу: «А багі яго ведаюць! Адчапіся. Што я табе — пані ці настаўніца? Бабуля твая, нябожчыца, пакаёўкай у пана была: тая табе адказала б!..»*

Старэйшы сябра Даніка Мікола дае яму іншую кнігу:

*«— Гэта Купала,— сказаў ён.— Той самы, што і пра Машку напісаў. Памятаеш? — падмаргнуў ён Даніку.*

*— Ыгы,— таксама пазмоўніцку ўсміхнуўся Сіві, успомніўшы пра бязмен.*

*— І пра мяне ён напісаў,— гартаў кнігу Мікола. — Глядзі вось, верш: «Я шавец-маладзец». І пра цябе напісаў. Пра цябе і пра маму тваю. Вось паглядзім. Ага! Ну, слухай».*

Янка Брыль — майстар, таму вобразы не выглядаюць кардоннымі, там няма пафасу і стэрэатыпаў... Так, ёсць злосныя польскія настаўнікі — адзін з іх, дарэчы, з тутэйшых, з суседняй вёскі, толькі апалячыўся і выбіўся ў паны. Але ёсць і настаўніца пані Мар'я, полька, справядлівая, добрая, якая з павагай ставіцца да беларускай культуры. Напрыклад, на адным з урокаў яна чытае дзецям з беларускай чытанкі «Родны край» апавяданне Цёткі «Міхаська».

*«І як заўсёды, калі пані Мар'я чытае па-беларуску, голас яе адразу стаў яшчэ мілейшы...»*

### МАКСІМ ТАНК «НАРАЧ»



Яўген Скурко яшчэ са школы далучыўся да вызваленчага руху. Першы яго зборнік называўся «На этапах» недарэмна — туды ўвайшлі вершы, напісаныя ў турме. Сярод твораў, прысвечаных змаганню, ёсць паэма «Нарач», напісаная ў 1937 годзе. У аснову лягло і народнае паданне пра Нарач, пра двух закаханых, што загінулі з-за акрутнага пана, і рэальныя палітычныя падзеі — паўстанне нарачанскіх рыбакоў, якім польскія ўлады забаранілі вольную лоўлю рыбы. Распавядае аўтар у паэме і пра сябе:

*«Не раз я за муром*
*астрожным*
*Па родных гонях сумаваў,*
*Па тых бярозах*
*прыдарожных,*
*Што на этапах сустракаў.*
*Не раз я думаў: як вярнуся*
*Дамоў, на волю,*
*зноў прайду*
*Па нівах, сёлах Беларусі*
*І пад дзяругаю астрожнай*
*Шмат прынясу напеваў-дум».*

Па матывах гэтай паэмы Максім Танк напісаў сцэнарый мастацкага фільма «Бура над Нараччу». Але фільм не быў пастаўлены, сцэнарый згубіўся, Танк пасля вайны спрабаваў яго знайсці, але так і не змог. Знайшоўся толькі ў наш час дзякуючы архівісту Віталю Скалабану.

*«В даль легла широкая дорога.*

*На дороге путевой столб. На нем белый польский орел и надпись: «Дорога к озеру Нарочь».*

*На дорогу наплывает волна. Потом другая, третья.*

*Волны накатывают на пустынный берег.*

*Озеро бурно и неприветливо. Низко нависли тяжелые тучи. Волны с грохотом разбиваются о берег.*

*На берегу развешен на сушилах огромный невод.*

*Ветер раскачивает его».*

У сцэнарыі захаваны сюжэт паэмы: пан Ялонскі аб'яўляе Нарач сваім уладаннем, малады рыбак Іван і яго брат Рыгор з таварышамі ўступаюць у змаганне. Паранены Іван тоне ў Нарачы на вачах нявесты Тацяны, не даплыўшы трохі да яе чаўна. Рыгор працягвае паўстанне.

*«Григорий, сжимая в руках винтовку, оглядел бурые, мужественные лица рыбаков, стеной стоящих за его плечами.*

*Сурово:*

*— Нет, дело не кончено. Братцы, дело только начинается. Но если дружно стоять будем...*

*Тряхнул винтовкой, с силой.*

*— КОНЧИМ».*

### МАКСІМ ГАРЭЦКІ «ВІЛЕНСКІЯ КАМУНАРЫ»



Змаганне беларусаў апісаў і Максім Гарэцкі ў рамане «Віленскія камунары». Раман стварaўся ў 1931—1932 гг. і з'яўляецца часткай эпічнай задумы Гарэцкага — апісаць лёсы сваіх сваякоў і аднавяскоўцаў і праз гэта паказаць лёс Беларусі. А вось лёс самога рамана быў нялёгкі. У 1960-х збіраліся мастацкія рады, каб вырашыць, як яго ацэньваць і ці пускаць у свет... Галоўны герой — «дзівак з мізэрным прозвішчам Мышка», валодае здольнасцю «не цярпець». Таму ўрэшце далучаецца да вызваленчага руху, трапляе ў турму:

*«Пасядзеў я ўсяго да паўдня 22 снежня, пяць дзён. Аднак жа паспеў дайсці дапледчым шляхам, што калі прыкласці рот да дзірачкі ў сцяне, дзе прымыкаецца нанач ложак, і гаварыць, дык у суседа чуваць. Калі ён адтуль гаварыў, мне трэба было прыкладваць вуха. А сцяна тоўстая, цэглы ў дзве ці ў дзве з паловаю. Дзірачка ж неглыбокая, сантыметраў пяць — сем, не болей.*

*Калі каму яшчэ трапіцца сядзець на Душніках, хай гэта возьме пад увагу. Толькі размаўляць трэба ціханька, каб не пачуў наглядач».*

Герой любіць родныя мясціны, родную вёску... Але *«Не змянілася і вёска маіх продкаў Жабракоўка, трапіўшы ў кіпцюры панскае Польшчы. І тыя даўныя паны, як Хвастуноўскія, і тыя новыя панкі, як Ромусі Рабэйкі — усю яе абселі, абкружылі і смокчуць з яе сокі...*

*Гібее Жабракоўка і цяпер таксама, як гібела і пяцьдзесят, і сто, і хто ведае колькі год таму назад. Але ж не сядзіць ужо так ціха, як бывала, не сядзіць...»*

### ПІЛІП ПЕСТРАК «СУСТРЭНЕМСЯ НА БАРЫКАДАХ»



*«Вецер на дарогах звёў нас. Шалёны вецер... Няма нічога дрэннага без добрага... З якой жа дарогі завітаеш да мяне, дарагая? Дзе ўбачу, пазнаю тваю постаць, тваю хаду? Ты мільгаеш мне ў вачах — статная, прыгожая, гордая і пяшчотная, свая, свая — дарагая... Нашы думкі спляліся ў адзін кветасты вянок, якога не ў сілах разарваць ніякі вораг. Мы носім у сабе нявызнанае харастко, песцім яго, як птушачку на далоні. У нас на сэрцах ляжаць раны народа, і цяжка, цяжка, калі яны адкрываюцца, крывавяць, калі ў іх запускае свае кіпцюры вораг...»*

Гэтак звяртаецца герой рамана Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах» да любай дзяўчыны. У рамане шмат біяграфічнага, і ў гэтым эпізодзе таксама: Піліп Пестрак адзінаццаць гадоў правёў у турмах Заходняй Беларусі, там, у вязніцы, і сустрэў каханую дзяўчыну, такую ж, як ён сам, мужную падпольшчыцу. Вядомым ён стаў найперш як паэт. А пасля вызвалення паспрабаваў адлюстраваць перажытае ў прозе, аб'ёмнай і нават грувасткай. Крытыка ацаніла раман добра. Якуб Колас пісаў: «Раман «Сустрэнемся на барыкадах», бясспрэчна, здабытак нашай нацыянальнай беларускай літаратуры». Хаця ёсць і заўвагі наконт кампазіцыі, цяжкаватасці стылю...

Піліп Пестрак паказвае, які таленавіты беларускі народ, якому акупанты адмаўляюць у праве на ўласную самабытнасць. Вось малады парабак Піліп Гайдук пачытаў беларускую газету і сам пачынае пісаць вершы:

*«Не век насіць ваду збан,*
*Бо на ўсё ёсць смерці час,—*
*Не век будзе ліхі пан*
*У балота таптаць нас».*

Селянін Пятрусь Хадыка — таленавіты скрыпач, сваёй музыкай абуджае ў душах прагу волі. І калі памірае збіты паліцэйскімі стары Сцяпан Касцевіч, бацька знявоіенага змагара, Пятрусь грае сваю музыку, стоячы на страсе:

*«А Пятрусь сапраўды стаяў на страсе, сонечны, высокі, і струны скрыпкі звінелі над вёскай, зліваліся з клёкатам бусла ў адно. Гукі ліліся, як з крыніцы серабрыстая вада... Гімн жыццю вялікаму іграе агністая скрыпка Петруся,— жыццю пражытаму, жыццю будучаму... Нездарма прыціхлі людзі і ўсё слухаюць і слухаюць, задуманыя. Прыціхлі дрэвы, прыціхлі птушкі... Усе ведаюць, чаму і для каго іграе Пятрусь!»*

Піліп Пестрак і сам быў выдатным музыкам, меў цудоўны голас — страціў яго ў засценках. Ад катаванняў і галадовак страціў валасы... Таму так уражвае апошняя частка кнігі, дзе змяшчаецца турэмны дзённік героя, насамрэч, вядома, аўтара:

*«...ліпень 1932 г.*

*Вярнуўся з карцэра. Прабыў там чацвёра сутак. Палітычных саджаюць толькі ў цёмныя карцэры. Такі карцэр — гэта каменны мяшок у падвале даўжынёю два доўгія крокі, шырынёю адзін крок. Там абсалютная цемра. Сцены з вялікіх круглых каменняў, па якіх слізіць, сцякае вада. Калі дакранешся да іх, то адхопіш руку, як ад каравай, агіднай жывёліны. Відаць, гэта засталіся яшчэ манастырскія карцэры.*

*...жнівень 1932 г.*

*Пяты дзень галадоўкі. У роце смак і пах балотнай твані. Самы цяжкі дзень галадоўкі — гэта трэці дзень. А цяпер ужо есці не хочацца. Стомленасць, нешта цягне і цягне з усіх жыл. Медыцына сказала б, што арганізм ужо корміцца за свой уласны кошт. Пракурор не прыходзіць, нягледзячы на нашы патрабаванні...*

*Не ізалявалі і сухотных — галадаюць разам. Мы іх прасім, каб елі. Адмаўляюцца. Дзе там есці, калі ўсе ў камеры ляжаць покатам, галадаюць».*

Раман заканчваецца тым, як галоўныя героі, Андрэй і яго каханая Надзя, едуць на Народны Сход Заходняй Беларусі як члены паўнамоцнай камісіі, каб прыняць рашэнне аб уз'яднанні Беларусі — гэта якраз пра Піліпа Пестрака і ягоную жонку.

*«Ад Народнага Сходу засталіся ў вушах толькі адны воплескі і крыкі «ўра»... Безупынныя воплескі. Аж душа ўжо не магла іх стрымліваць. Там гаварыліся прамовы, прымаліся рашэнні аб нацыяналізацыі фабрык, заводаў, банкаў, зямлі, лясоў, рэк і азёр. Галоўнае, была радасць, было захапленне ад сустрэчы з усходнімі свабоднымі братамі. Усё гэта вылівалася аж за берагі. Хацелася толькі глядзець на іх, доўгачаканых, усміхацца і вітаць узрывамі радасці».*

### ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ «ЛУКІШСКІЯ ВЕРШЫ»



Паэт Валянцін Таўлай пражыў усяго трыццаць тры гады, з іх сем правёў у турмах панскай Польшчы. Яго першы зборнік выйшаў ужо пасля смерці аўтара. Хоць той пісаў усё жыццё — сачыняў, нават седзячы за кратамі. Не ўсё мог захаваць запісаным, завучваў. Потым, пасля вызвалення, з цяжкасцю «вытрасаў з памяці». У яго ёсць некалькі цыклаў «астрожных вершаў», эмацыянальных, кранальных і мужных. Цыкл «Лукішскія вершы» быў напісаны ў 1935 годзе, творы з яго сталі хрэстаматыйнымі:

*«Я сам і пасядзець магу,*
*А вершам — часу шкода:*
*Шумець ім трэба на сцягу*
*І калыхаць паходы.*
*Глядзі ў ваўчок як дзень,*
*так ноч, —*
*Не ўбачыш, чорт зіркаты,*
*Што я заўзята і даўно*
*Пілую вершам краты».*

Згадана, зразумела, далёка не ўсё вартае, што напісана пра змагароў Заходняй Беларусі, якія набліжалі дзень уз'яднання. Горка згадаць, колькі напісанага было панішчана, канфіскавана ці проста знікла... Але тое, што засталося, занатоўвае для нас нашу гісторыю, якую нельга забываць.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Шануй сваё

# ГІСТОРЫЯ І ДАСЯГНЕННІ, ТРАДЫЦЫІ І КАШТОЎНАСЦІ

## Першы ў краіне Музей народнага адзінства створаны ў сярэдняй школе № 1 Баранавічаў

**Сярэдняя школа № 1 імя С. І. Грыцаўца самая новая ў Баранавічах. Яе гісторыя налічвае ўсяго тры гады. Столькі ж і Музею народнага адзінства, які адкрылі для наведвальнікаў 17 верасня 2021 года.**

Цікава, што ідэя стварыць музей нарадзілася незадоўга да адкрыцця школы. На рэалізацыю задуманага было не надта шмат часу. Канцэпцыю прыдумалі настаўнікі гісторыі на чале з намеснікам дырэктара школы Таццянай Маклюк. Можна сказаць, што з работай педагогі справіліся выдатна. Поспеху спрыяў яшчэ і той факт, што музей стварылі талакой. Школьнай грамадскасці дапамагалі 61-я авіяцыйная база, Міністэрства абароны, Галоўнае ўпраўленне па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, Баранавіцкі краязнаўчы музей. Гарвыканкам выдзеліў 10 тысяч рублёў, далучыўся і мясцовы бізнес.

— Наш музей выклікае цікавасць не толькі ў дзяцей, але і ў дарослых, — сказала **дырэктар школы Марына КУПЦОВА.** — Таму што народнае адзінства — гэта нашы культура, грамадзянскасць, гісторыя, рэлігія, гэта яшчэ спагада і шчырасць, дабрыня і цярпімасць. Значэнне і змест гэтых слоў мы і раскрываем у музейнай экспазіцыі. Упэўнена, што музей служыць справе выхавання вучняў у духу патрыятызму, прывівае любоў да Радзімы і да сваёй роднай мясціны, спрыяе павазе да людзей, якія здольныя ахвяраваць сабой дзеля жыцця іншых.

Наведвальнікаў, асабліва юных, у музеі прываблівае сучаснае афармленне і форма падачы матэрыялу. Выкарыстаны магнітныя панэлі, мабільныя стэнды, QR-коды, галаграфічны вентылятар, інфармацыйны барабан і іншыя дасягненні інфармацыйных тэхналогій. Усё гэта дазваляе не толькі слухаць экскурсавода, але і, напрыклад, быць актыўным віртуальным падарожнікам па рэгіёнах краіны.

Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў. Першы называецца «У адзінстве наша сіла» і расказвае аб станаўленні беларускай дзяржаўнасці з полацкага перыяду да нашых часоў. Тут жа паказана гісторыя Баранавічаў. Цэнтральная частка музея прысвечана сучаснай Беларусі, раздзел так і называецца «Беларусь сучасная». Тут адлюстраваны дасягненні краіны, традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, яе эканамічныя і культурныя асаблівасці. Гасцям даецца магчымасць пазнаёміцца са структурай органаў дзяржаўнай улады з дапамогай інтэрактыўнага стэнда, які круціцца, інакш яго называюць інфармацыйным «барабанам». У музеі таксама ўстаноўлены чатыры мабільныя падлогавыя стэнды, якія расказваюць аб традыцыях і дасягненнях беларускага народа. З культурнай спадчынай і карцінамі беларускіх мастакоў можна пазнаёміцца праз дэманстрацыю на каляровай мазаіцы і праекцыю на галаграфічным вентылятары.

Яшчэ адзін вялікі раздзел экспазіцыі пад назвай «Бессмяротны подзвіг «крылатых» герояў» знаёміць наведвальнікаў з подзвігам лётчыкаў, лёс якіх звязаны з горадам Баранавічы. У іх ліку — праслаўлены ўраджэнец Баранавіцкага раёна двойчы Герой Савецкага Саюза Сяргей Грыцавец, першы Герой Беларусі Уладзімір Карват, авіятары Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч, якія загінулі над польскім горадам Радам, а таксама Андрэй Нічыпорчык і Мікіта Куканенка, якія тры гады таму адвялі амаль няспраўны самалёт ад шчыльнай жылой забудовы і цаной свайго жыцця папярэдзілі яшчэ большую трагедыю.

Наведвальнікі музея могуць пасядзець у сапраўдным авіяцыйным трэнажоры, што з задавальненнем робяць школьнікі. Экскурсантам пакажуць гідрашлем і гідракасцюм лётчыкаў, іншыя экспанаты авіяцыйнай тэматыкі.

А два гады таму на другім паверсе школы была адкрыта вялікая зала музея, прысвечаная перыяду Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа.

І галоўнае, што музей жыве насычаным жыццём і актыўна развіваецца. Яго **дырэктар Аляксандр ЛІТВІНОВІЧ** расказаў карэспандэнту газеты, што на базе музея працуе школьнае аматарскае аб'яднанне ваенна-гістарычнага краязнаўства. Дзейнасць яго скіравана на вывучэнне гісторыі роднага краю, збор і апрацоўку інфармацыі пра ваеннае мінулае Баранавіцкага краю, правядзенне пошукавай работы. Юныя следапыты са сваім настаўнікам ужо аднавілі 36 імёнаў невядомых герояў вайны, а да гэтага невядомымі лічылася ўсяго 25 асоб. «Цяпер мы працуем над увекавечаннем іх памяці, — працягвае Аляксандр Уладзіміравіч. — Дакументы ў дзяржаўныя органы і ва ўсе зацікаўленыя ведамствы накіравалі. Працягваем пошук ужо па Баранавіцкім раёне».

Яшчэ Аляксандр Літвіновіч расказаў, што музей развіваецца ў розных кірунках. Рыхтуецца экспазіцыя старых падручнікаў: знайшлі кнігі, па якіх вучыліся равеснікі цяперашніх школьнікаў 150 гадоў таму. Адным словам, музей аб'ядноўвае дзяцей з самымі рознымі інтарэсамі і спрыяе развіццю ў іх навыкаў пошуку, аналізу інфармацыі, а значыць, пабуджае да чытання, вывучэння той ці іншай тэмы. Увесь час папаўняюцца матэрыялы існуючых раздзелаў. Напрыклад, знайшлі новыя цікавыя матэрыялы пра Сяргея Грыцаўца. А яшчэ экспазіцыя ўдасканальваецца ў плане дапоўненай рэальнасці. Цяпер з дапамогай смартфона карцінку можна ажывіць, і наведвальнік атрымае інфармацыю ў прывычнай для яго форме, што асабліва важна для юных.

За час існавання Музея народнага адзінства яго наведалі больш за 5 тысяч чалавек. Створаны YouTube-канал музея, з дапамогай якога можна здзейсніць віртуальныя экскурсіі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**











У лабірынтах мастацтва

# ПАНО ДА ДНЯ ЯДНАННЯ БЕЛАРУСІ

## Невядомая карціна Аляксандра Дэблера

**Мастак Аляксандр Дэблер, прафесар Інстытута жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна, памёр у лістападзе 1981 года ў Ленінградзе ва ўзросце 73 гады. Падумаць толькі, 40 гадоў таму можна было б пагутарыць з ім і ўсё распытаць аб гэтай карціне і гісторыі яе стварэння...**
**І хаця ён быў дэканам факультэта жывапісу доўгія гады, я, тады студэнтка гэтага інстытута, нават не ведала, як ён выглядае. Запомнілася толькі шыльдачка з яго імем на дзвярах дэканата факультэта.**
**І вось праз 30 гадоў пасля яго смерці, у 2004 годзе, у Мінску ў сховішчах Нацыянальнага мастацкага музея разгарнулі для фатаграфавання адзін са старых рулонаў (рулон № 8), на якім сярод трохчасткавых твораў мастакоў Івана Ахрэмчыка і Валянціна Волкава была накручана і карціна Дэблера «Сустрэча Чырвонай Арміі з вызваленым народам Заходняй Беларусі».**
**Таго самага Дэблера. Ён напісаў карціну ў 1940 годзе па замове Беларускага ўрада для Беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы ў Маскве, цяпер ВДНГ. З устанаўленнем дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства — карціна гэтая зноў набыла актуальнасць і выклікала вялікую цікавасць.**

### У антычных традыцыях

У 1935 г. Саўнаркам СССР прыняў пастанову аб стварэнні ў Маскве Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы (ВСХВ), якая павінна была адкрыцца 1 жніўня 1937 г. Сціплае аблічча многіх драўляных павільёнаў нацыянальных рэспублік выклікала незадаволенасць партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў, якія ўдзялялі вялікую ўвагу выставе. Крытыка тады не цырымонілася. Так, павільён Украіны параўналі з «чыстай стайняй», а Беларусі — з «багатым свіранам». Адкрыццё было адкладзена на два гады. Новы павільён БССР будаваўся па праекце і пад кіраўніцтвам іншых архітэктараў, якія раней працавалі ў маскоўскай майстэрні ўраджэнца Міншчыны Івана Жалтоўскага, — Васіля Сімбірцава і Барыса Бархіна.

Будынак адрозніваўся святочнасцю, дэкаратыўнасцю і яркасцю, нават некаторай пышнасцю. Гэты павільён задаволіў беларускае партыйнае кіраўніцтва.

У тыя ж гады ішла старанная падрыхтоўка экспанатаў выставы, пра якую перыядычна паведамляла прэса. Былі прыцягнуты найлепшыя творчыя сілы Беларусі. Чаго толькі там не меркавалася зрабіць! «12 жывапісцаў, графікаў, афарміцеляў пад кіраўніцтвам мастака Алтуф'ева заняты дэталёвай распрацоўкай і падрыхтоўкай малюнкаў, па якіх будзе замоўлены шэраг высокамастацкіх рэчаў для афармлення Беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы. Распрацоўваюцца малюнкі тканін і посцілак, якія будуць замоўлены 27 найлепшым ткачыхам у БССР», — пісала прэса. З апісанняў па дэкараванні інтэр'ераў вядомы і работы беларускіх скульптараў — барэльеф «Беларусь — фарпост СССР» Андрэя Бембеля, «Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс» Заіра Азгура, бюсты правадыроў савецкай дзяржавы. Звонку павільёна быў разбіты сквер са скульптурнай групай «Лявоніха» скульптара Аляксея Глебава. Акрамя скульптараў, падобныя адказныя замовы на пано атрымалі яшчэ і жывапісцы: з БССР — Іван Ахрэмчык («Свята беларускага народа») і Валянцін Волкаў («Кастрычнік у Беларусі»), з Расіі — Аляксандр Дэблер («Знатныя людзі Савецкай Беларусі»).

Выстава была ўрачыста адкрыта 1 жніўня 1939 года.

Праз два месяцы пасля гістарычных падзей 17 верасня 1939 года ўзнікла неабходнасць дапоўніць выставу карцінай-пано на тэму ўз'яднання беларускіх зямель, якая б спалучалася з ужо існуючымі творамі мастацтва. Замову на манументальнае пано «Сустрэча Чырвонай Арміі з вызваленым народам Заходняй Беларусі», якую трэба было



выканаць максімальна хутка, атрымаў маскоўскі жывапісец Аляксандр Дэблер. Памеры палатна відавочна дыктаваліся ўмовамі памяшкання беларускага павільёна.

Чаму выбралі менавіта Дэблера, можна толькі меркаваць: ён, вучань Аляксандра Савінава і Кузьмы Пятрова-Водкіна, быў прафесіяналам — скончыў факультэт манументальнага жывапісу, а ў Беларускім саюзе мастакоў было мала манументалістаў, здольных справіцца з такой складанай задачай. Немалую ролю адыграла і тая акалічнасць, што карціна будзе выканана на месцы і не запатрабуе перавозкі.

Дэблер усяго два гады таму скончыў Інстытут пралетарскіх выяўленчых мастацтваў (былую Акадэмію мастацтваў) у Ленінградзе і пераехаў у Маскву ў 1938 годзе — быў запрошаны на выкладчыцкую працу ў Маскоўскі мастацкі інстытут. Яму ў той час быў толькі 31 год. Але, нягледзячы на маладосць, аб'ём працы ён зрабіў каласальны. Маляўнічае пано павінна было быць даўжынёй 9 метраў.

Маляўнічы фрыз мусіў стаць часткай скульптурнага ансамбля афармлення павільёна і адпавядаць яго стылістыцы. Ахрэмчык і Волкаў напісалі свае трохчасткавыя пано ў тэхніцы грызайлю, галоўны складнік якой — аднатоннасць. Грызайль часта ўжывалася для імітацыі скульптурных барэльефаў і гарэльефаў.

Фрыз Дэблера выкананы высокапрафесійна ў традыцыях акадэмічнай школы. Яшчэ ў студэнцкія гады па патрабаванні свайго настаўніка прафесара Аляксандра Савінава, захопленага ў той час вывучэннем антычна-манументальных традыцый, ён шмат маляваў і пісаў злепкі з калекцыі Акадэміі мастацтваў, абмяркоўваючы сваю працу з настаўнікам. Дэблер у канцы жыцця ўспамінаў: «Аддайцеся пачуццю прыгажосці», — сказаў мне ён ціха, нібы па сакрэце... Ён ніколі нічога не навязваў. Калісьці мне сказаў: «Пацікаўцеся новым жывапісам, імпрэсіянізмам. Вам будзе гэта карысна». І гэты запавет я пранёс праз усё жыццё».

Гэта апора на веліч шэдэўраў антычнасці адчувальная і ў фрызе Дэблера для Беларускага павільёна, які павінен прадстаўляць ілюзію гэткага шэсця — накшталт скульптурнага фрыза афінскага Парфенона. Ён нібы ўвабраў у сябе высакародную прыгажосць, строгасць і гармонію элінскай традыцыі з аднаго боку і шырокі, нават рваны мазок жывапісу з кантраснымі «ажыўкамі» бялiламі — з другога. У гэтым фрыз Дэблера моцна адрозніваецца ад статыкі Ахрэмчыка і экспрэсіўнага руху ў фрызе ў выкананні Волкава.

Пано змяшчае ў сабе складаную кампазіцыю з некалькіх мізансцэн, убачаную скрозь прызму антычнасці. Чырвонаармейцы паўстаюць на ёй рашучымі ваярамі, чырвоная конніца, прадстаўленая адзіным вершнікам у цэнтры, адсылае да старажытных калясніц. Кампазіцыя палатна ўяўляе сабой урачыстае сустрэчнае шэсце. Злева направа ідуць, чаканячы крок, шыхты чырвоных воінаў, конны камандзір, матацыкліст; справа налева — жыхары Беларусі, цікаўныя хлапчукі, жанчыны ў хустках з малымі дзецьмі, з кветкамі. Нібы на плакаце, абдымаюцца воін і селянін. Пано напісана шырока, вольна, у разліку на далёкі агляд.

Цяпер застаецца загадкай, як мастак мог так хутка напісаць такую карціну не на некалькіх палотнах, як яго калегі-мастакі, а на вялізным суцэльным палатне 9 метраў у даўжыню. Як ён прадумваў кампазіцыю, у якую ўвайшлі ўсе разнастайныя ракурсы і паставы народа, які сустракае Чырвоную Армію? Некаторыя кампазіцыйныя знаходкі Дэблера пасля расхапаюць іншыя мастакі для сваіх карцін. Напрыклад, вобраз матацыкліста быў выкарыстаны Волкавым у карціне «Мінск. 3 ліпеня» ў 1940-я гады.

### Дзесяцігоддзі ў рулоне

Карціны беларускіх мастакоў упрыгожвалі Беларускі павільён сельскагаспадарчай выставы да кастрычніка 1941 года, калі ён быў зачынены. З першых дзён вайны Дэблер поплеч са сваімі студэнтамі працаваў на будаўніцтве абарончых збудаванняў пад Вязьмай і Смаленскам, а ў кастрычніку 1941 года ён разам з інстытутам эвакуіруецца ў Самарканд. А праз год там жа, у Самаркандзе, па прапанове Ігара Грабара пераходзіць на выкладчыцкую працу ва Усерасійскую акадэмію мастацтваў, з якой у далейшым будзе звязана ўсё яго жыццё.

У ваенныя гады выстава не працавала. А ў 1951 годзе перад чарговай перабудовай і рэканструкцыяй павільёнаў усе творы мастакоў з Беларускага павільёна, жывапісныя пано Дэблера, Волкава і Ахрэмчыка перадалі ў Мінск у Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Там гэтая карціна сярод іншых праляжала, згорнутая ў рулон, яшчэ 14 гадоў. Сам аўтар ужо не ведаў яе лёсу і месцазнаходжання.

У 1965 годзе яна трапляе ў Дзяржаўны музей, а ў 1969 годзе знаходзіць, нарэшце, пастаянны прытулак — навукова-дапаможны фонд Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Была заінвентарызавана ў 1973 годзе, а ў 1990-я гады паступіла ў збор беларускага жывапісу.

На пачатку 2000-х супрацоўніцы аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, збіраючы звесткі аб гэтай карціне, працавалі з фондам Дэблера ў Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу, дзе Дэблер выкладаў на працягу 40 гадоў. Вельмі цікавае іх назіранне: калі на пачатку свайго шляху ён згадваў гэты твор некалькі паблажліва, проста як юнацкі вопыт і выгадны заказ, то, чым больш часу праходзіла, тым больш ён пачынаў шанаваць сваю працу, таму што паступова прыходзіла разуменне, што гэта адзіны маштабны твор, які ён стварыў за ўсё творчае жыццё.

Дэблер пасля вайны паглыбіўся ў педагогіку, не на карысць уласнай творчасці. Цікава, што ён, здаецца, адмовіўся ад удзелу ў мастацкім жыцці Ленінграда. Магчыма, гэта здарылася пасля таго, як яго звольнілі з інстытута ў 1951 годзе і запрасілі зноў пасля смерці Сталіна ў 1953-м. Магчыма, тады ён вырашыў быць толькі педагогам. Дэблер з-за гэтага не быў сябрам Ленінградскага Саюза савецкіх мастакоў. Адзіная выстава, арганізаваная яго дачкой, прайшла пасля яго смерці ў сценах роднага інстытута ў 1987 годзе і стала фактычным «адкрыццём мастака». Дэблер усё ж увайшоў у мастацтва Ленінграда як тонкі псіхолаг-партрэтыст. Некалькі алейных партрэтаў сяброў і родных, напісаных ім на працягу жыцця, было перададзена дачкой у Дзяржаўны рускі музей. Асабліва цікавыя для беларусаў яго партрэтынакіды з аднакурсніка мастака Залмана Мірынгофа, які загінуў у мінскім гета ў 1942 годзе.

Аляксандра Дэблера да гэтага часу адносяць да сціплых і незнакамітых майстроў «невядомага сацрэалізму». Праз шмат гадоў высвятляецца, што Дэблер выявіў сябе найболей маштабна і значна толькі ў гэтым раннім заказным палатне, якое належыць Беларусі. Выставачны лёс гэтай карціны незайздросны: яна была выстаўлена толькі з 1940 да 1941 года. Астатнія 70 гадоў свайго існавання яна праляжала ў рулоне, які разматваўся часам для фатаграфавання і праверкі стану захавання.

У нашы дні яе паказвалі толькі ў рэпрадукцыі ў 2008 годзе на выставе «І даўжэй за стагоддзе».

Але выставіць яе і ў наш час праблематычна з-за фармату, бо вырабляцца яна для пэўнай канцэпцыі паказу ў спецыяльнай выставачнай прасторы. З гадамі гэты манументальныя жывапісны фрыз Аляксандра Дэблера нібы набраў вагу і значнасць. Верыцца, што ў новых музейных прасторах палатно нарэшце здабудзе сваё месца.

**Надзея УСАВА, мастацтвазнаўца.**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Солигорскторг»** *(продавец)* проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**• мастерская строительной группы, инв. № 644/С-34968 общей площадью 132,9 кв. м, расположенная по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Коммунальнаая, 12/1;**

**• склад одноэтажный, инв. № 644/С-34944 общей площадью 202 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Солигорск, район рынка «Колхозный»;**

**• склад одноэтажный** *(составные части и принадлежности: проезд, площадка, 2 (два) ограждения)***, инв. № 644/С-38829 общей площадью 429 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Коммунальная, 12/2,**

**• многолетние зеленые насаждения: (инвентарная карточка № ст-57 (клен – 2 шт., береза – 11 шт., липа – 3 шт., груша – 1 шт., ясень – 1 шт., туя – 1 шт., осина – 1 шт., тополь – 1 шт.).**

**• оборудование: пожарная сигнализация на объекте «Здание склада мастерской строительной группы», инв. № сг-7.**

**Капитальные строения с инв. №№ 644/С-34968, 644/С-34944, 644/С-38829, многолетние зеленые насаждения и оборудование расположены на земельном участке: кадастровый номер 625050100001002273, площадь 0,4334 га, (право постоянного пользования).**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона водопроводов, пл. 0,0793 га; охранная зона канализации, пл.0,0878 га; охранная зона тепловых сетей, пл. 0,0025 га.*

**• автогараж № 3,** *(составные части и принадлежности: смотровая яма),* **инв. № 644/С-56580 общей площадью 32,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003037 (право постоянного пользования) площадью 0,0044 га по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2И.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,0044 га.*

**• автогараж № 5, инв. № 644/С-56586 общей площадью 29,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003038 (право постоянного пользования) площадью 0,0042 га по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2Ж.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,0042 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0011 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **282 973,87** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **28 297,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 50 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169 330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Проект договора купли-продажи соответствует приложению к решению Солигорского районного исполнительного комитета № 3668 от 28.12.2012.

Оплата производится в следующем порядке:

- оплата 30 (тридцать) процентов стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 70 (семидесяти) процентов в течение 5 (пяти) календарных месяцев (по 14 %), с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь, либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на его проведение, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объектов).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 29.12.2022, 02.03.2023, 18.04.2023, 19.05.2023, 14.07.2023, 16.08.2023, 23.11.2023, 01.02.2024, 29.05.2024, 14.08.2024.

Аукцион состоится **30.09.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.09.2024** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 029 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (0174) 260-731.**

УНН 600122715

**Минское областное потребительское общество извещает о проведении повторных электронных торгов**

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 135 «ХОЗТОВАРЫ»

**с инвентарным номером 620/С-44315 общей площадью 256,1 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622255900001000338 площадью 0,104 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Железнодорожная, 32.**

Начальная цена с НДС (20 %) – 515000,00 белорусских рублей. Задаток 10 % от начальной цены – 51500,00 белорусских рублей.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества: № 81322, Недвижимость/Прочее.

Объект обременен договором аренды по 31.12.2026.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 04.10.2024 9.00 до 04.10.2024 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Единая система электронных торгов по электронному адресу: https://torgi.gov.by.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу https://torgi.gov.by/lot/81322/18687/zdanie-magazina-135-hoztovary-s-inventarnym-nomerom-620-s-44315-raspolozhennoe-po-adresu-minskaya-oblast-dzerzhinskij-rajon-g-фanipol-ul-zheleznodorozhnaya-32- необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 04.10.2024 9.00.

Задаток должен быть зачислен на счет:

| Республиканское унитарное предприятие «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь» | |
|---|---|
| Адрес | г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513 |
| тел. | 200-95-63, 200-73-33, 200-64-11 |
| УНП | 190318109 |
| р/с | BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ» |
| БИК | BELBBY2X |

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 28 дней со дня завершения электронных торгов.

Справочная информация: контактные телефоны продавца имущества: 8 (01716) 9-96-53, 37529 578-35-46.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составляют 5 % или менее в зависимости от конечной цены за лот, согласно прейскуранту https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.pdf

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

УНП 600037767

## Извещение о проведении **15 октября 2024 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

**Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-113573 общей площадью 1181,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения. Обременение: аренда (23,1 кв. м – по 31.03.2025; 250 кв. м – по 31.12.2024) | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 273 671,02 | 27 300,00 |
